40 гадоў таму (1974) выйшла ў свет кніга "Витебск. Историко-экономический очерк".

40 гадоў таму (1974) ў г. п. Арэхаўск Аршанскага раёна адкрыта дзіцячая музычная школа.

40 гадоў таму (1974) ў Віцебску была адкрыта абласная дзіцячая бальніца.

40 гадоў таму (1974) пачаў работу Аршанскі малочны камбінат.

40 гадоў таму (1974) ў Віцебску адкрыты Палац урачыстых абрадаў.

40 гадоў таму (1974) ва Ушацкім раёне адкрыты мемарыяльны комплекс "Прарыў".

40 гадоў таму (1974) прыняў першых навучэнцаў Лепельскі гідрамеліярацыйны тэхнікум.

40 гадоў таму (1974) заснаваны Пастаўскі раённы краязнаўчы музей.

40 гадоў таму (1974) заснаваны Гарадоцкі раённы краязнаўчы музей.

40 гадоў таму (1974) ў Гарадку створаны мемарыяльны комплекс на вайсковых могілках.

40 гадоў таму (1974) створана Віцебская абласная арганізацыя Беларускага саюза архітэктараў.

40 гадоў таму (1974) створаны Докшыцкі хлебазавод – філіял РУВП "Віцебскхлебпрам".

40 гадоў таму (1974) ў Гарадку створаны вакальна-танцавальны ансамбль "Яблынька" пры раённым Доме культуры. З 1983 г. – Гарадоцкі народны ансамбль песні і танца "Яблынька".

40 гадоў таму (1974) заснаваны калгас "Дворец труда" на базе калгасаў "Зара" і "Шлях Сталіна" ў Чашніцкім раёне. З 2003 г. – СВК "Дворец труда".

40 гадоў таму (1974) заснаваны Віцебскі карданажна-паліграфічны камбінат. З 2009 г. – ААТ.

40 гадоў таму (1974) створаны Глыбоцкі камбікормавы завод. З 2001 г. – УСВП у складзе Дэпартамента па хлебапрадуктах Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання.

6. **Через** годы в день сегодняшний / подгот. В. В. Линьков [и др.] // Вестник академии ветеринарной медицины. — 2009. — № 5 (дек.). — С. 2.

СНЕЖАНЬ

ЛЕПЕЛЬСКІ РАЁННЫ КРАЯЗНАЎЧЫ МУЗЕЙ

Да 60-годдзя з дня адкрыцця (1954)

Лепельскі раённы краязнаўчы музей быў заснаваны 4 лістапада 1953 года. Адкрыты для наведвальнікаў 8 снежня 1954 года.

Будынак музея з’яўляецца помнікам архітэктуры XIX стагоддзя. У 1880–1950 гг. у ім размяшчалася кантора былой Бярэзінскай воднай сістэмы.

Вялікі ўклад у вывучэнне краю яшчэ ў XIX стагоддзі ўнёс знакаміты лепельскі археолаг М. Кусцінскі. У 1920 г. у Лепельскім павеце былі створаны краязнаўчае таварыства і музей пры аддзеле народнай асветы. Паслядоўнае і сістэматычнае даследаванне Лепельшчыны

сакавіка 2002 г. – Лужаснянскі аграрны каледж. З ліпеня 2002 г. – у структуры Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

За пасляваенны час у тэхнікуме было падрыхтавана больш за 10000 спецыялістаў: ветэрынараў, заатэхнікаў, аграномаў, птушкаводаў (птушкаводчае аддзяленне існавала да 1988 г.). Увесь час працуюць курсы павышэння кваліфікацыі брыгадзіраў і іншых спецыялістаў. На кафедрах выкладаюць больш за 100 настаўнікаў і майстроў вытворчага навучання. Навучанне праводзіцца ў трох карпусах, у тым ліку лабараторна-практычным на 900 месцаў. Студэнцкі гарадок уключае 4 інтэрнаты. Працуе сталовая на 300 месцаў. Навучальная ўстанова мае стадыён з гумова-бітумным пакрыццём і трыбунамі на 1200 месцаў. Асаблівы гонар каледжа – будынак былой земляробчай школы, які з'яўляецца помнікам гісторыі і культуры. Зараз у ім размешчана кафедра механізацыі сельскай гаспадаркі. За добраўпарадкаванне тэрыторыі ў савецкія часы тэхнікум быў узнагароджаны дыпломам II ступені ВДНГ СССР.

Сярод выхаванцаў тэхнікума акадэмік НАН Беларусі А. І. Лапо, прафесар, доктар сельскагаспадарчых навук А. В. Круглякоў.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Арсеньев, А.** Конверт в честь столетия колледжа / А. Арсеньев // Народнае слова. — 2010. — 20 лют. — С. 6.

2. **Залесская, С.** Школа, где профессию делают призванием / С. Залесская // Белорусская нива. — 2009. — 19 дек. — С. 12.

3. **Лужаснянскі** сельскагаспадарчы тэхнікум // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн, 1999. — Т. 9. — С. 359.

4. **Лужеснянский** аграрный колледж // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. — Мн. : БелЭн, 2007. — Т. 4. — С. 555.

5. **Мурашкина, В.** Жить так уже можно! / В. Мурашкина // Народнае слова. — 2009. — 22 верас. — С. 3.

40 гадоў таму (1974) выяўлена радовішча будаўнічага пяску і пясчана-гравійнай сумесі ў Полацкім раёне. Дэталёва разведана ў 1985–1988 гг.

40 гадоў таму (1974) знойдзены ананімны беларускі празаічны твор сярэдзіны 18 стагоддзя "Казане руске схизматичне", які, верагодна, узнік у г. Віцебску і стылізаваны пад праваслаўную ("схізматычную" раскольніцкую) пропаведзь.

35 гадоў таму (1979) ў Віцебску ўстаноўлены бюст С. М. Кіраву.

35 гадоў таму (1979) заснаваны і адкрыты Бешанковіцкі гісторыка-краязнаўчы музей.

35 гадоў таму (1979) ў Віцебску створана аб'яднанне "Рамбыттэхніка". Зараз – дзяржаўнае камунальнае УП "Вітрамбыт".

35 гадоў таму (1979) створаны Віцебскі хор "Вясёлка" пры СШ № 27. У 1989 г. прысвоена званне "ўзорны аматарскі калектыў".

35 гадоў таму (1979) ў Глыбоцкім і Ушацкім раёнах створаны азёрны заказнік рэспубліканскага значэння "Белае". З 2007 г. – гідралагічны.

35 гадоў таму (1979) ў Полацкім раёне заснаваны азёрны заказнік. З 2007 г. – гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння "Глыбокое-Вялікае Астравіта".

35 гадоў таму (1979) ў Віцебскім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння "Запольскі".

35 гадоў таму (1979) ва Ушацкім раёне заснаваны гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння "Крывое".

35 гадоў таму (1979) ў Полацкім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння "Лонна".

35 гадоў таму (1979) ў Віцебскім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння "Мошна".

35 гадоў таму (1979) ў Браслаўскім раёне заснаваны гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння "Рычы".

35 гадоў таму (1979) ў Шумілінскім раёне заснаваны гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння "Сосна".

35 гадоў таму (1979) ў Расонскім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння "Фаміно".

35 гадоў таму (1979) ў Віцебскім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння "Чысцік".

35 гадоў таму (1979) было адкрыта Віцебскае дзяржаўнае вучылішча алімпійскага рэзерву.

35 гадоў таму (1979) Верхнядзвінская раённая бібліятэка была рэарганізавана ў цэнтральную раённую бібліятэку.

35 гадоў таму (1979) ў г. п. Бешанковічы быў заснаваны Музей баявой славы. Зараз – Бешанковіцкі раённы гісторыка-краязнаўчы музей.

35 гадоў таму (1979) быў адкрыты Віцебскі абласны псіханеўралагічны дыспансер.

35 гадоў таму (1979) ў Оршы пры дзіцячай музычнай школе № 1 быў створаны Аршанскі народны духавы аркестр.

35 гадоў таму (1979) заснаваны Адаменскі народны фальклорны гурт "Медуніца" сельскага Дома культуры Лёзненскага раёна.

35 гадоў таму (1979) створаны Віцебскі духавы аркестр пры СШ № 1. У 1982 г. прысвоена званне "ўзорны аматарскі калектыў".

35 гадоў таму (1979) створаны Віцебскі хор пры школе мастацтваў № 1 на базе харавога аддзялення. У 1983 г. прысвоена званне "ўзорны аматарскі калектыў". Зараз – Віцебскі ўзорны хор.

35 гадоў таму (1979) ў г. Глыбокае створана будаўнічае прадпрыемства СПМК-176. З 2003 г. – даччынае камунальнае ўнітарнае будаўнічае прадпрыемства Глыбоцкая СПМК-26.

35 гадоў таму (1979) ў Віцебску заснаваны завод ВА "Саюзэнерга-аўтаматыка". Зараз – Віцебскі вопытна-эксперыментальны завод.

35 гадоў таму (1979) ў Полацкім раёне заснаваны гідралагічны заказнік рэспубліканскага значэння "Глыбокае–Чарбамысла".

ў Гарадку царкоўнапрыходскай школы. Дзякуючы намаганням віцэ-старшыні Віцебскага таварыства сельскіх гаспадароў была распачата судовая справа супраць губернскага ўпраўлення праваслаўнай кансісторыі. У 1906 г. працэс быў выйграны дзякуючы пецярбургскаму адвакату Альшамоўскаму.

Такім чынам, школа замест 1884 г. стала працаваць толькі праз 25 гадоў. Пры школе была створана сельскагаспадарчая ферма, даследчае поле, сад, садовы пітомнік, сталярная майстэрня, кузня. Пачаў дзейнічаць земляробчы гурток, кіраўніком якога з’яўляўся вядомы краязнавец, сапраўдны стацкі саветнік В. К. Златкоўскі.

Пасля рэвалюцыі 1917 года земляробчае вучылішча працягвала працу. З 1920 г. – сельскагаспадарчая школа II ступені. З 1928 г. – сельскагаспадарчая школа тэхнічных культур. З 1929 г. – тэхнікум па тэхнічных культурах. З 1930 г. – Лужаснянскі дзяржаўны сельскагаспадарчы льнопяньковы тэхнікум Наркамата земляробства БССР. Да Вялікай Айчыннай вайны было падрыхтавана 1150 спецыялістаў па льнаводстве.

У час вайны ў памяшканнях тэхнікума размяшчаўся фашысцкі гарнізон. На месцы сучаснага дэндрапарка – нямецкі аэрадром. У будынках сельскагаспадарчага двара быў арганізаваны лагер для палонных чырвонаармейцаў, мясцовых жыхароў, западозраных у сувязях з партызанамі. За перыяд акупацыі былі знішчаны бібліятэка, лабараторнае абсталяванне, вучэбна-вопытная гаспадарка.

У 1944 г. тэхнікум аднавіў сваю дзейнасць. Спецыялізацыя змянілася – з’явіліся спецыяльнасці агранома і птушкавода. З 1965 г. – сельскагаспадарчы тэхнікум (у 1983–1996 гг. – саўгас-тэхнікум). У 1970 г. адбылося аб’яднанне Лужаснянскага і Бігосаўскага зааветэрынарнага тэхнікумаў. Быў пабудаваны новы корпус і студэнцкі гарадок. У 1974 г. быў створаны дэндралагічны парк, які ў 1994 г. быў абвешчаны помнікам прыроды мясцовага значэння. У 1977 г. тэхнікуму прысвоена імя яго выпускніка Ф. А. Сурганава. У 1983 г. Лужаснянскі сельскагаспадарчы тэхнікум імя Ф. А. Сурганава значна пашырыў свае ўладанні шляхам далучэння вучгаса «Лужасна» і стаў называцца «саўгас-тэхнікум». З

ЛУЖАСНЯНСКІ АГРАРНЫ КАЛЕДЖ ВІЦЕБСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАЙ АКАДЭМІІ ВЕТЭРЫНАРНАЙ МЕДЫЦЫНЫ

Да 105-годдзя з дня заснавання (1909)

Лужаснянскае ніжэйшае сельскагаспадарчае вучылішча было адчынена 15 лістапада 1909 года (першая сельскагаспадарчая ўстанова Віцебскай губерні).

У 1876 г. было створана Віцебскае таварыства сельскіх гаспадароў. У 1881 г. віцебскі губернатар Растоўцаў перадаў сабраныя сялянамі на святкаванне 25-годдзя праўлення цара Аляксандра II грошы (некалькі дзясяткаў тысяч) на заснаванне сельскагаспадарчай школы і ўзорнай фермы. Таварыства ўзаемнага крэдыту землеўладальнікаў Віцебскай губерні пералічвала 5 % ад чыстага прыбытку на ствараемую школу. Пасля Растоўцава на пасаду віцебскага губернатара быў прызначаны генерал фон Валь, які таксама спрыяў дзейнасці таварыства. У 1891 г. таварыства выкупіла маёнтак Лужасна са 101 дзесяцінай зямлі і гаспадарчымі пабудовамі ў памешчыцы Е. Краснадземскай на частку грошай, якія знаходзіліся на дэпазіце губернскага ўпраўлення па сялянскіх справах. Меркавалася распачаць будаўніцтва сельскагаспадарчай школы, але з прыходам новага губернатара князя В. М. Далгарукага грошы былі перададзены на будаўніцтва

35 гадоў таму (1979) ў Глыбоцкім раёне заснаваны азёрны заказнік "Доўгае". З 2007 г. гідралагічны.

35 гадоў таму (1979) ў Браслаўскім раёне заснаваны біялагічны заказнік рэспубліканскага значэння "Забалацце".

30 гадоў таму (1984) выйшла кніга В. М. Ляўко "Экскурсия по древнему Витебску".

30 гадоў таму (1984) ў г. п. Арэхаўск Аршанскага раёна быў створаны Арэхаўскі народны хор.

30 гадоў таму (1984) ў Браславе заснаваны гісторыка-краязнаўчы музей на базе школьнага музея. Зараз – Браслаўскае раённае аб'яднанне музеяў.

30 гадоў таму (1984) ў Оршы заснаваны гарадскі Дом культуры. Зараз – Аршанскі гарадскі Цэнтр культуры.

30 гадоў таму (1984) створаны Віцебскі камерны хор пры тэлевізійным заводзе. У 1989 г. прысвоена званне "народны аматарскі калектыў".

30 гадоў таму (1984) заснаваны Шумілінскі гісторыка-краязнаўчы музей.

25 гадоў таму (1989) ў Віцебску адкрыўся Літаратурны музей.

25 гадоў таму (1989) ў Віцебску здадзены ў эксплуатацыю Палац культуры і тэхнікі лёгкай прамысловасці. Зараз – КЗ "Віцебск".

25 гадоў таму (1989) заснаваны Полацкі ўзорны ансамбль народнай музыкі "Таўкачыкі" дзіцячай школы мастацтваў.

25 гадоў таму (1989) ў Оршы заснаваны музей гісторыі і культуры. Адкрыты 12.12.1992 г.

25 гадоў таму (1989) ў Віцебску створана сумеснае беларуска-германскае прадпрыемства "Белвест".

25 гадоў таму (1989) адноўлена Полацкая епархія.

25 гадоў таму (1989) ў Полацку быў адноўлены Спаса-Еўфрасіннеўскі жаночы манастыр.

25 гадоў таму (1989) была створана Віцебская абласная філармонія на базе гастрольна-канцэртнага аддзялення Беларускай дзяржаўнай філармоніі.

25 гадоў таму (1989) адкрыты Глыбоцкі Дом рамёстваў.

25 гадоў таму (1989) створаны Верхнядзвінскі народны клуб народных майстроў і самадзейных мастакоў пры раённым Доме культуры. З 2005 г. дзейнічае пры раённым Доме рамёстваў.

25 гадоў таму (1989) ў в. Валынцы Верхнядзвінскага раёна быў заснаваны Валынецкі краязнаўчы музей імя І. Д. Чэрскага. З 2009 г. – Верхнядзвінскага раёна дзяржаўны краязнаўчы музей імя І. Д. Чэрскага.

25 гадоў таму (1989) ў Віцебску заснаваны завод харчовых канцэнтратаў. З 1991 г. – прадпрыемства па вытворчасці сухіх сняданкаў і кандытарскіх вырабаў "Віцьба".

25 гадоў таму (1989) заснаваны Дрысвяцкі фальклорны гурт "Вярба" сельскага Дома культуры Браслаўскага раёна. У 1998 г. прысвоена званне "народны".

25 гадоў таму (1989) ў Віцебску створаны аркестр народных інструментаў пры Палацы культуры і тэхнікі прафсаюзаў. У 1993 г. прысвоена званне "ўзорны аматарскі калектыў". З 2000 г. – Віцебскі ўзорны аркестр народных інструментаў "Расінка".

25 гадоў таму (1989) заснаваны Каўшэлеўскі фальклорны ансамбль "Купалінка" сельскага Дома культуры Шаркаўшчынскага раёна. У 1999 г. прысвоена званне "народны".

25 гадоў таму (1989) створана Гарадоцкае народнае аматарскае аб'яднанне "Зялёная альтанка" пры раённай бібліятэцы. У 1995 г. прысвоена званне "народны аматарскі калектыў".

25 гадоў таму (1989) створаны Віцебскі тэатр гульні на базе гарадскога Цэнтра культуры. У 1995 г. прысвоена званне "народны аматарскі тэатр".

БССР яго творы распаўсюджваліся сярод падпольшчыкаў і працоўных, заклікалі іх на барацьбу з нацыянальнымі прыгнятальнікамі. Народныя мсціўцы спявалі «Марш беларускіх партызан» на словы Паўла Сушко.

У пасляваенны час выступаў з вершамі і допісамі ў раённым, абласным і рэспубліканскім друку. Вершы Паўла Сушко «Сцяжынка» і «Ой, ішла дзяўчына» пакладзены на музыку М. Пятрэнкам і А. Палонскім. Рукапісны зборнік яго вершаў «Адгалоскі» захоўваецца ў акадэмічнай бібліятэцы ў Вільнюсе.

Памёр 26 верасня 1974 года.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Ліякумовіч, Ц. Б.** Сушко Павел / Ц. Б. Ліякумовіч, Т. М. Махнач // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А. В. Мальдзіса. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. — Т. 5. — С. 453—454.

2. **Мароз, Б.** Паэт-партызан / Б. Мароз // Міёрскія навіны. — 2010. — 23 лют. — С. 2.

3. **Сушко, П. П.** Сушко Павел Міхайлавіч / П. П. Сушко // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1987. — Т. 5. — С. 201.

4. **Сушко** Павел Міхайлавіч // Памяць : Міёрскі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. М. Маняк [і інш.] ; уклад. Л. А. Матэленак ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : Бел. навука, 1998. — С. 539—540.



СУШКО

ПАВЕЛ МІХАЙЛАВІЧ

Да 105-годдзя з дня нараджэння (1909)

Павел Міхайлавіч Сушко нарадзіўся 7 лістапада 1909 года ў в. Сушкі Дзісенскага павета Віленскай губерні (зараз – Міёрскі раён Віцебскай вобласці). Беларускі паэт.

Бацькі Паўла Сушко працавалі ў сельскай гаспадарцы. Да уз’яднання Заходняй Беларусі з БССР ён дапамагаў ім у працы, актыўна падтрымліваў гуманістычныя антыфашысцкія ідэі народнага фронту. Пасля ўз’яднання – адзін з арганізатараў першага ў Міёрскім раёне калгаса «Баявы партызан», старшыня Чэраскага сельсавета. У гады Вялікай Айчыннай вайны – сувязны партызанскага атрада «Масква», партызан 4-й Беларускай партызанскай брыгады. Пасля вайны ўдзельнічаў у аднаўленні разбуранай гаспадаркі.

У 1938 г. Павел Сушко пачаў друкавацца ў прагрэсіўных газетах і часопісах Заходняй Беларусі. У 1943 г. паэт выступаў з нататкамі пад псеўданімам Язэп Сяўня ў газеце «Кліч партызана» (орган Міёрскага падпольнага райкама КП(б)Б).

Павел Міхайлавіч пісаў вершы пра заходнебеларускае падполле, гераізм партызан, услаўляў радасць мірнай працы, апяваў хараство родных краявідаў. Яго паэзія шчырая, непасрэдная, прасякнутая дабрынёй, еднасцю з людзьмі працы. Да ўз’яднання Заходняй Беларусі з

25 гадоў таму (1989) ў Віцебску створаны гурток "Фальклор" пры гімназіі № 7. У 1999 г. прысвоена званне "ўзорны аматарскі калектыў" і сучасная назва. Зараз – Віцебскі ўзорны фальклорны тэатр "Пралеска".

25 гадоў таму (1989) створаны Віцебскі фальклорны калектыў "Зорачкі" пры СШ № 15. У 2006 г. прысвоена званне "ўзорны аматарскі калектыў".

25 гадоў таму (1989) ў Шаркаўшчынскім раёне на базе калгасаў імя Даватара і імя Энгельса заснаваны СВК "Доваторский".

20 гадоў таму (1994) ў Віцебску адбыўся I Міжнародны Шагалаўскі пленэр.

20 гадоў таму (1994) створаны Віцебскі дзіцяча-юнацкі тэатр моды "Наш стыль" пры абласным аб'яднанні па арганізацыі пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі. У 2004 г. прысвоена званне "ўзорны аматарскі калектыў".

20 гадоў таму (1994) быў заснаваны Аршанскі гарадскі Дом рамёстваў пры гарадскім Палацы культуры.

20 гадоў таму (1994) створаны Верхнядзвінскі народны вакальна-харэаграфічны ансамбль "Ярыца" пры раённым Доме культуры. У 1996 г. прысвоена званне "народны аматарскі калектыў".

20 гадоў таму (1994) створаны Віцебскі Цэнтр народных рамёстваў і мастацтваў "Задзвінне".

20 гадоў таму (1994) створана Аршанская ўзорная студыя эстраднай песні "Рафлезія" пры гарадскім Доме культуры. У 1996 г. прысвоена званне "ўзорны аматарскі калектыў".

20 гадоў таму (1994) створана Віцебская мастацкая студыя "Тюбики" пры Мастацкім музеі. У 1998 г. прысвоена званне "ўзорная мастацкая студыя".

20 гадоў таму (1994) створана Віцебская пачатковая студыя-школа выяўленчага мастацтва "Парасткі" пры абласным аб'яднанні па арганізацыі пазашкольнай работы з дзецьмі і падлеткамі.

20 гадоў таму (1994) ў Віцебску пры СШ № 3 створаны гурток "Паэтычны тэатр". У 2006 г. прысвоена званне "ўзорны аматарскі калектыў" і сучасная назва. Зараз – Віцебскі ўзорны тэатральны калектыў "Прэм'ера".

20 гадоў таму (1994) ў Віцебску заснавана ЗАТ са спецыялізацыяй па забеспячэнні і збыту ў галіне малой і сярэдняй энергетыкі. З 2000 г. – прадпрыемства па вытворчасці і рэалізацыі водаачышчальнага абсталявання.

20 гадоў таму (1994) створана Наваполацкае ТАА фірма "Белсервис" – будаўніча-мантажнае і праектнае прадпрыемства.

20 гадоў таму (1994) ў Віцебску заснавана вытворчае рамонтна-будаўнічае прадпрыемства "Дэльта". З 2001 г. – ТАА.

15 гадоў таму (1999) ў в. Лявонпаль Міёрскага раёна заснаваны музей радзімазнаўства.

15 гадоў таму (1999) заснаваны Пастаўскі раённы архіў па асабовым складзе.

15 гадоў таму (1999) створаны Віцебскі народны ансамбль народнай песні "Сябрына" пры ВА "Маналіт". У 2007 г. прысвоена званне "народны аматарскі калектыў".

15 гадоў таму (1999) ў Пастаўскім і іншых раёнах Беларусі заснаваны Нацыянальны парк "Нарачанскі".

15 гадоў таму (1999) Віцебскі медыцынскі інстытут быў перайменаваны ў Віцебскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт ордэна Дружбы народаў.

15 гадоў таму (1999) ў Браславе гарадскі Дом культуры быў перайменаваны ў Браслаўскі раённы Дом культуры.

15 гадоў таму (1999) пабудаваны Віцебскі Палац спорту.

15 гадоў таму (1999) ў Віцебску створана народная эстрадна-вакальная студыя "Канстанта" пры Доме культуры Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны. У 2008 г. прысвоена званне "народны аматарскі калектыў".

Сергей Николаевич Вышелесский умер 14 января 1958 года.

Учреждена медаль им. С. Н. Вышелесского, присуждаемая раз в три года за выдающиеся научные работы и открытия в области эпизоотологии. Белорусскому научно-исследовательскому ветеринарному институту, который был основан в 1930 г. по предложению С. Вышелесского, присвоено его имя, а студентам Витебской академии ветеринарной медицины присуждается специальная стипендия. Архангельской областной ветеринарной лаборатории было присвоено имя знаменитого ученого. В его честь названа одна из улиц в д. Кунцевщина Минского района и г. п. Оболь Шумилинского района.

ЛИТЕРАТУРА:

1. **Вышалескі** Сяргей Мікалаевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн, 1997. — Т. 4. — С. 329.

2. **Вышелесский** Сергей Николаевич // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. — Мн. : БелЭн, 2006. — Т. 2. — С. 850—851.

3. **Именитый** земляк родом из Оболи // Ветеринарная газета. — 1997. — 1 янв. — С. 5.

4. **Латушкин, В.** Имя из славной когорты / В. Латушкин // Народнае слова. — 2004. — 1 чэрв. — С. 6.

5. **Сергей** Николаевич Вышелесский // Память : историко-документальная хроника Шумилинского района / редкол.: И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.] ; худож. А. Н. Хилькевич. — Мн. : БелСЭ им. П. Бровки, 1985. — С. 512—513.

ученую степень доктора ветеринарной медицины.

В 1914–1917 гг. – заведующий Усть-Цилемской ветеринарно-бактериологической лабораторией в Архангельске, где занимался изучением болезней северных оленей. С 1917 г. – профессор Ставропольского сельскохозяйственного института. На этом рабочем месте Сергей Николаевич проявил себя как умелый организатор ветеринарной науки, ветеринарного дела, а также как участник ликвидации ряда опаснейших эпизоотических болезней в стране. В 1922 г. Вышелесского переводят в Государственный институт экспериментальной ветеринарии, где он организовал и возглавил отдел по изучению туберкулеза и сапа. С 1928 г. Сергей Николаевич возглавлял Белорусский государственный ветеринарно-бактериологический институт в Витебске, где организовал кафедру эпизоотологии. В 1930–1931 гг. – заведующий отделами по изучению сапа и туберкулеза Всесоюзного института экспериментальной ветеринарии в Москве. В 1931–1933 гг. – заведующий кафедрой эпизоотологии Алма-Атинского зооветеринарного института и научный руководитель Казахского научно-исследовательского ветеринарного института. В 1933–1934 гг. – научный руководитель Московского научно-исследовательского ветеринарного института. С 1934 г. – заведующий кафедрами эпизоотологии Московского зооветеринарного института и Военно-ветеринарной академии (с 1948 г. – Московская ветеринарная академия).

Сергей Николаевич Вышелесский внес выдающийся вклад в изучение, лечение и ликвидацию многих опасных инфекционных болезней животных. Им опубликовано более 150 научных работ (8 монографий). Отдельные книги переведены на иностранные языки. В 1941 г. ученому присуждена Сталинская премия за научные труды по изучению заразных болезней животных и за разработку методов их лечения.

За многогранную деятельность Сергей Вышелесский награжден двумя орденами Ленина, орденами Трудового Красного Знамени, «Знак Почета» и медалями.

15 гадоў таму (1999) створаны Верхнядзвінскі народны клуб аматараў моды "Вобраз" пры дзіцячай школе мастацтваў. У 2004 г. прысвоена званне "народны аматарскі калектыў".

15 гадоў таму (1999) ў Віцебску створаны ансамбль рускіх народных інструментаў выкладчыкаў на базе дзіцячай музычнай школы № 4. З 2005 г. – Віцебскі народны ансамбль "Кантраст". У 2006 г. прысвоена званне "народны аматарскі калектыў".

15 гадоў таму (1999) ў Полацку створана творчае аб'яднанне маладых мастакоў "Белый круг".

15 гадоў таму (1999) Каўшэлеўскаму фальклорнаму ансамблю "Купалінка" сельскага Дома культуры было прысвоена званне "народны".

15 гадоў таму (1999) Гарадоцкі фальклорны калектыў "Глейна" быў створаны пры раённым метадычным Цэнтры народнай творчасці культасветработы. У 2007 г. прысвоена званне "народны аматарскі калектыў".

15 гадоў таму (1999) ў Віцебску было заснавана замежнае ПУВП "Вителла" – прадпрыемства па вытворчасці шакаладнай, какавазмяшчаючай глазуры, сухіх сумесяў для шакаладных пастаў, цукрыстых кандытарскіх вырабаў. З 2000 г. – рэзідэнт свабоднай эканамічнай зоны "Віцебск".

15 гадоў таму (1999) створаны Віцебскі народны хор пры УП "Віцебскаблгаз". У 2009 г. прысвоена званне "народны аматарскі калектыў".

15 гадоў таму (1999) Верхнядзвінскі эстрадны гурт "Праект" быў створаны пры СШ № 1. У 2004 г. прысвоена званне "народны аматарскі калектыў".

15 гадоў таму (1999) створана Віцебская студыя эстраднай песні "Форум" пры гарадскім Цэнтры культуры. У 2002 г. прысвоена званне "ўзорны аматарскі калектыў".

15 гадоў таму (1999) створана Вусцеўскае аматарскае аб'яднанне "Жаночыя сакрэты" пры сельскай бібліятэцы Аршанскага раёна. У 2003 г. прысвоена званне "народны аматарскі калектыў".

15 гадоў таму (1999) заснавана свабодная эканамічная зона "Віцебск".

15 гадоў таму (1999) заснаваны ландшафтны заказнік рэспубліканскага значэння "Казьянскі" ў Полацкім і Шумілінскім раёнах на базе былога аднайменнага паляўнічага заказніка.

10 гадоў таму (2004) ў Пастаўскім раёне адкрыты дзіцячы рэабілітацыйны аздараўленчы цэнтр "Ветразь".

10 гадоў таму (2004) была створана Віцебская народная мужчынская вакальная група пры прыватным УП "Элект" Беларускага таварыства інвалідаў па зроку. У 2007 г. прысвоена званне "народны аматарскі калектыў".

10 гадоў таму (2004) ў в. Бычкі Ушацкага раёна быў заснаваны Быкава Васіля сядзіба-музей – філіял Ушацкага музея народнай славы.

10 гадоў таму (2004) ў в. Акцябрская створаны Віцебскі раённы Цэнтр народных мастацкіх рамёстваў "Адраджэнне".

10 гадоў таму (2004) створаны Віцебскі ўзорны аркестр народных інструментаў "Спадчына" пры СШ № 25. У 2008 г. прысвоена званне "ўзорны аматарскі калектыў".

10 гадоў таму (2004) створана Аршанская студыя эстрадных спеваў Дубль № пры гарадскім Цэнтры культуры. У 2007 г. прысвоена званне "ўзорны аматарскі калектыў".

10 гадоў таму (2004) ў Віцебску створаны тэатр "Адзіны варыянт" пры ВДУ імя П. М. Машэрава. У 2008 г. прысвоена званне "народны аматарскі калектыў" і сучасная назва. Зараз – Віцебскі народны маладзёжны тэатр "Кола".

10 гадоў таму (2004) ў Віцебску заснавана сумеснае беларуска-германскае прадпрыемства па вытворчасці алкагольных і безалкагольных напіткаў ААТ "Двинский бровар".

ВЫШЕЛЕССКИЙ
СЕРГЕЙ НИКОЛАЕВИЧ
К 140-летию со дня рождения (1874)

Вышелесский Сергей Николаевич родился 1 ноября 1874 года в г. п. Оболь Шумилинского района. Основоположник отечественной эпизоотологии, почетный академик ВАСХНИЛ, академик АН БССР, заслуженный деятель науки РСФСР, доктор ветеринарных наук, профессор.

В 1895 г. Сергей Вышелесский окончил Витебскую духовную семинарию и поступил в Варшавский ветеринарный институт. За участие в студенческих революционных выступлениях исключен с последнего курса института и выслан в Брянск. Только в самом конце учебного года он получил разрешение сдавать экзамены экстерном.

После окончания института Сергей Николаевич шесть лет работал ветеринарным врачом Чериковского, Лепельского, Невельского уездов. Затем – нештатным врачом-ассистентом и заведующим отделом по изготовлению вакцин и сывороток в ветеринарно-бактериологической лаборатории в Петербурге. В 1910–1913 гг. Сергей Николаевич Вышелесский находился в заграничной командировке, где написал несколько ценных научных работ. За одну из них совет медицинского факультета Лейпцигского университета присвоил С. Вышелесскому

ЛІТАРАТУРА:

1. **Багдановіч, І. Э.** Ракіта Сяргей / І. Э. Багдановіч, В. М. Грышкевіч // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А. В. Мальдзіса. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. — Т. 5. — С. 134—135.

2. **Ракіта** Сяргей // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн, 2001. — Т. 13. — С. 284.

3. **Ракіта** Сяргей (Сяргей Васілевіч Законнікаў) // Памяць : Дубровенскі раён : у 2 кн. : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: А. Я. Гаўруцікаў [і інш.] ; склад. А. Я. Гаўруцікаў, Р. П. Кахноўская ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : Паліграфафармленне, 1997. — Кн. 1. — С. 515.

4. **Ракіта** Сяргей // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1987. — Т. 4. — С. 482.

5. **Шушкевіч, С.** Паэт-агітатар першых пяцігодак / С. Шушкевіч // Літаратура і мастацтва. — 1969. — 17 кастр. — С. 3.

10 гадоў таму (2004) ўтвораны сельскагаспадарчы вытворчы філіял ААТ "Лепельскі малочнакансервавы камбінат" "Заазер'е" ў Лепельскім раёне.

10 гадоў таму (2004) заснавана сельскагаспадарчае прадпрыемства "Дружбинец" у Сенненскім раёне.

5 гадоў таму (2009) Валынецкі краязнаўчы музей імя І. Д. Чэрскага быў перайменаваны ў Верхнядзвінскага раёна дзяржаўны краязнаўчы музей імя І. Д. Чэрскага.

5 гадоў таму (2009) створаны Гарадоцкі літаратурны клуб "Городнянка" пры цэнтральнай раённай бібліятэцы.

СТУДЗЕНЬ

40 гадоў таму (1974) пушчана першая чарга Аршанскага інструментальнага завода.

1 студзеня – 95 гадоў таму (1919) ў Віцебску нацыяналізаваны ўсе кінатэатры.

1 студзеня – 85 гадоў таму (1929) заснавана Віцебскае аддзяленне Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі. З 1938 г. – Віцебская абласная бібліятэка імя У. І. Леніна.

1 студзеня – 40 гадоў таму (1974) адкрыты Наваполацкі політэхнічны інстытут. З 1993 г. – Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт.

2 студзеня – 65 гадоў таму (1949) нарадзіўся Андрэйчанка Уладзімір Паўлавіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі, старшыня Віцебскага абласнога выканаўчага камітэта (1994–2008 гг.), ураджэнец в. Мар'янава Лёзненскага раёна.

2 студзеня – 65 гадоў таму (1949) нарадзіўся Яленскі Мікалай Георгіевіч, беларускі вучоны ў галіне педагогікі і філалогіі, доктар педагагічных навук, прафесар, ураджэнец в. Акунёва Міёрскага раёна.

4 студзеня – 120 гадоў таму (1894) нарадзіўся Пугачэўскі Палікарп Восіпавіч (1894–1939), военачальнік, ураджэнец в. Чарневічы Глыбоцкага раёна.

5 студзеня – 245 гадоў таму (1769) нарадзіўся Вітгенштэйн Пётр Хрысціянавіч (1769–1843), расійскі ваенны дзеяч, удзельнік вырашальных баёў у Айчынную вайну 1812 г. на тэрыторыі Беларусі (Полацкай бітвы і інш.), генерал-фельдмаршал.

5 студзеня – 215 гадоў таму (1799) нарадзіўся Сямашка Іосіф (1799–1868), царкоўны дзеяч Расійскай Імперыі, ініцыятар і актыўны ўдзельнік Полацкага царкоўнага сабора 1839 г., які прыняў рашэнне аб далучэнні ўніяцкай царквы да праваслаўнай.

5 студзеня – 50 гадоў таму (1964) нарадзіўся Канстанцінаў Валерый Міхайлавіч, беларускі вучоны ў галіне матэрыялазнаўства сплаваў для ахоўных пакрыццяў, тэрмічнай і хіміка-тэрмічнай апрацоўкі металаў і сплаваў, доктар тэхнічных навук, ураджэнец г. Полацка.

6 студзеня – 165 гадоў таму (1849) нарадзіўся Сямеўскі Васіль Іванавіч (1849–1916), гісторык, эканаміст, грамадскі дзеяч, ураджэнец г. Полацка.

6 студзеня – 100 гадоў таму (1914) нарадзіўся Лебяда Тодар (сапр. Шырокаў або Шыракоў Пётр Фёдаравіч 1914–1970), драматург, паэт, празаік, публіцыст, ураджэнец г. Віцебска.

7 студзеня – 125 гадоў таму (1889) нарадзіўся Данілаў Сцяпан Мікалаевіч (1889–1978), вучоны ў галіне арганічнай хіміі, член-карэспандэнт АН СССР, ураджэнец г. Віцебска.

адначасова вучыўся ў Мінскім Камуністычным інстытуце журналістыкі.

Стаў ахвярай сталінскіх рэпрэсій. 19 кастрычніка 1936 г. Сяргей Ракіта быў арыштаваны і асуджаны на 10 гадоў зняволення ў лагерах. Працаваў на лесасплаве ў Горкаўскай вобласці. Загінуў у лагеры на лесапавале, афіцыйная дата смерці можа быць недакладнай. Рэабілітаваны пасмяротна ў 1956 годзе.

Першыя вершы Сяргея Ракіты з'явіліся ў «Аршанскім маладняку» ў 1928 годзе. Тады ж ён пачаў выступаць і з нарысамі (пад псеўданімам С. Асот). Сталы літаратурны псеўданім «Ракіта» замацаваўся за пісьменнікам з 1930 года. Пад гэтым псеўданімам неўзабаве былі выдадзены ў Гомелі дзве кнігі вершаў паэта: «Альбо-альбо» (увайшла ў калектыўны зборнік «Разгон») і «Я агітую за пяцігодку».

Паэзія С. Ракіты неаддзельная ад кантэксту свайго часу. Ідэя стварэння новага мастацтва, якое ўспрымалася няйначай як «зброя пралетарыята» ў барацьбе за перамогу сусветнай рэвалюцыі і якое адмятала ўсё асабістае, інтымнае, пазначаючы яго як мяшчанскае, была ўспрынята С. Ракітам (таксама і іншымі маладымі паэтамі) як абсалютна прагрэсіўная з'ява, як надзённая рэвалюцыйная задача, і шчыра, натхнёна, усім сваім талентам ён ёй служыў, ствараючы на практыцы некан'юнктурныя ўзоры «пралетарскай паэзіі». Гэтым тлумачыцца агітацыйны і дэкларатыўны характар многіх яго вершаў, іх «ударная» фабрычная тэматыка, скразныя матывы супрацьпастаўлення «ганебнага ўчора» «шчаслівому сёння», імпэтнае жаданне «наноў перарабіць сусвет», гарачая вера ў справядлівасць рэвалюцыйных ідэалаў і ў камуністычную будучыню. Яго паэзія сагрэта пачуццём акрыленасці, гордасці за сваю краіну, за той магутны працоўны ўздым – «энтузіязм мас», – які будзіла ў людзях святая вера ў Вялікае заўтра.

Паэт не ведаў тады, што гэта быў палон ілюзій, які абярнуўся ў рэшцэ рэшт лагерным дротам.

І. Э. Багдановіч

РАКІТА СЯРГЕЙ

Да 105-годдзя з дня нараджэння (1909)

Ракіта Сяргей (сапр. Законнікаў Сяргей Васілевіч) нарадзіўся 15 кастрычніка 1909 года ў вёсцы Ліцвінава Аршанскага павета Магілёўскай губерні (зараз – Дубровенскі раён Віцебскай вобласці). Памёр 23 сакавіка 1942 года на станцыі Сухабязводнае Горкаўскай вобласці. Беларускі паэт.

Паходзіў з сялянскай сям'і. Бацька яго ўдзельнічаў у рэвалюцыйных падзеях, у 1918 г. быў старшынёй камбеда ў роднай вёсцы, шмат увагі ўдзяляў выхаванню і адукацыі сына. Сяргей Ракіта скончыў пачатковую школу ў Ліцвінаве, потым хадзіў за дзесяць кіламетраў у сярэднюю школу 2-й ступені ў в. Новая Тухінь, якую скончыў у 1925 годзе.

З юнацтва яго захапіла камсамольская работа: быў сакратаром мясцовай камсамольскай ячэйкі, у 1927 г. выбраны членам аршанскага акруговага камітэта ЛКСМБ. У гэты час ён пасылаў свае допісы ў аршанскую акруговую газету «Камуністычны шлях». У 1929 г. яго накіравалі на працу ў гомельскую абласную газету «Палеская праўда». У 1930 г. Сяргей Ракіта стаў адказным сакратаром Гомельскай філіі БелАПП. У 1932–1933 гг. – служыў у арміі. Пасля працаваў у Мінску ў рэдакцыях газет, на Беларускім радыё, у Дзяржаўным выдавецтве БССР,

7 студзеня – 50 гадоў таму (1964) нарадзіўся Бышнёў Ігар Іванавіч, беларускі вучоны-арнітолаг, эколаг, рэжысёр, сцэнарыст, аператар дакументальнага кіно, ураджэнец в. Халамер'е Гарадоцкага раёна. З 1985 г. працаваў у Бярэзінскім біясферным запаведніку.

8 студзеня – 115 гадоў таму (1899) нарадзіўся Башко Іосіф Станіслававіч (1889–1946), ваенны лётчык, Георгіеўскі кавалер, ураджэнец Віцебскай вобласці.

8 студзеня – 95 гадоў таму (1919) выйшаў у свет артыкул "Художественные заметки" Марка Шагала.

8 студзеня – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Савіцкі Алесь (сапр. Аляксандр Ануфрыевіч), беларускі пісьменнік, ураджэнец г. Полацка.

8 студзеня – 60 гадоў таму (1954) ліквідавана Полацкая вобласць.

9 студзеня – 105 гадоў таму (1909) нарадзілася Осіпава Марыя Барысаўна (1909–1999), удзельніца Мінскага камуністычнага падполля і партызанскага руху ў Мінскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнка в. Серкавіцы Талачынскага раёна.

10 студзеня – 95 гадоў таму (1919) нарадзіўся Гейнэ Аркадзь Андрэевіч (1919–1942), паэт, ураджэнец г. п. Бешанковічы.

10 студзеня – 85 гадоў таму (1929) нарадзіўся Сачак Міхаіл Рыгоравіч, беларускі вучоны ў галіне хірургіі. З 1966 г. працуе ў Віцебскім дзяржаўным медыцынскім універсітэце.

13 студзеня – 95 гадоў таму (1919) нарадзіўся Завадскі Уладзімір Георгіевіч (1919–1992), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Оршы.

14 студзеня – 70 гадоў таму (1944) нарадзіўся Барздыка Міхаіл Фёдаравіч, беларускі мастак, графік, ураджэнец в. Шклянцы Докшыцкага раёна.

15 студзеня – 115 гадоў таму (1899) нарадзіўся Скальскі Сцяпан Уладзіміравіч (1899–1972), беларускі акцёр. У 1926–1965 гг. працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

15 студзеня – 105 гадоў таму (1909) нарадзіўся Фамін Яўхім Майсеевіч (1909–1941), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, адзін з кіраўнікоў абароны Брэсцкай крэпасці 1941 г., ураджэнец в. Калышкі Лёзненскага раёна.

15 студзеня – 60 гадоў таму (1954) нарадзіўся Башлакоў Юрый Андрэевіч, беларускі вучоны-гісторык, ураджэнец г. Оршы.

16 студзеня – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Кірычук Васілій Паўлавіч (1924–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза.

18 студзеня – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Смірноў Уладзімір Яфімавіч (1924–1943), удзельнік вызвалення Лёзненскага раёна ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза.

18 студзеня – 65 гадоў таму (1949) нарадзілася Круцько Эльвіра Ціханаўна, беларускі вучоны ў галіне хіміі і тэхналогіі палімерных матэрыялаў, ураджэнка г. п. Бешанковічы.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Варатынская, Г.** Кінематаграфіст з Ушаччыны / Г. Варатынская // Патрыёт (Ушачы). — 2004. — 22 снеж. — С. 4.

2. **Іваноўскі, В. С.** Халіп Уладзімір Трафімавіч / В. С. Іваноўскі // Тэатральная Беларусь : энцыклапедыя : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; пад агул. рэд. А. В. Сабалеўскага. — Мн. : БелЭн, 2003. — Т. 2. — С. 496.

3. **Іваноўскі, В. С.** Халіп Уладзімір Трафімавіч / В. С. Іваноўскі // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1987. — Т. 5. — С. 433.

4. **Савік, Л. С.** Халіп Уладзімір / Л. С. Савік, З. У. Драздова // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А. В. Мальдзіса. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. — Т. 6. — С. 167—168.

5. **Халіп** Уладзімір Трафімавіч // Памяць : Ушацкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. К. Кісялёў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. М. М. Кірпіч ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : БЕЛТА, 2003. — С. 553.

перыядычных выданняў па праблемах тэатра, кіно. Даследуе заканамернасці сцэнічнага ўвасаблення «недраматургічных» твораў, аналізуе спектаклі, у аснове якіх раманы і аповесці беларускіх пісьменнікаў («Радок, прачытаны тэатрам»). Аўтар лібрэта опер «Джардана Бруна» (музыка С. Картэса, адзначана 2-й прэміяй на Усесаюзным конкурсе музычна-сцэнічных твораў, у 1977 г. – пастаўлена тэатрам оперы і балета БССР), «Матухна Кураж і яе дзеці» (пастаўлена тэатрамі Каўнаса, Кішынёва, Якуцка), «Візіт старой дамы» (паводле Ф. Дзюрэнмата).

Уладзімір Трафімавіч Халіп напісаў сцэнарыі двухсерыйнага мастацкага фільма «Полымя» (суаўтары Г. Бураўкін, Ф. Конеў, у 1975 г. пастаўлены рэжысёрам В. Чацверыковым на кінастудыі «Беларусьфільм», адзначаны галоўнай прэміяй на 8-м Усесаюзным кінафестывалі), пяцісерыйнага тэлефільма «Нас выбраў час» (суаўтар А. Петрашкевіч, у 1976–1978 гг. пастаўлены рэжысёрам М. Пташуком), прысвечаных партызанскаму руху ў гады фашысцкай акупацыі. Па сцэнарыях Уладзіміра Халіпа на кінастудыі «Беларусьфільм» пастаўлены мастацкі фільм «Мама, я жывы!» (1985, рэжысёр І. Дабралюбаў); дакументальныя фільмы «Брэсцкая крэпасць» (1975, суаўтар і рэжысёр І. Пікман), «Тры колеры радасці» (1979, суаўтар А. Кудравец, рэжысёр І. Вейняровіч), «Саюз рэспублік і сэрцаў» (1982, суаўтар А. Кудравец, рэжысёры І. Вейняровіч, В. Каралёў, І. Шышкоў); кароткаметражныя фільмы «Стаялі насмерць» (1976, рэжысёр І. Пікман), «Я, салдат Брэсцкай крэпасці…» (1980, рэжысёр І. Пікман), «Чырвоны сшытак» (1981, рэжысёр І. Пікман, адзначаны прызам за лепшы сцэнарый на 14-м Усесаюзным кінафестывалі) і інш. Сенсацыяй на беларускім экране стаў шматсерыйны мастацкі фільм «Пракляты ўтульны дом», сцэнарыстам якога быў Уладзімір Трафімавіч Халіп.

Уладзімір Халіп піша п’есы пра маральна-этычныя праблемы нашай сучаснасці («Цень гары», у 1987 г. пастаўлены Беларускім тэатрам імя Я. Коласа), выдатных дзеячаў мінулага («Ратнікі вечнасці» пра М. Гусоўскага).

Жыве ў Мінску.

19 студзеня – 75 гадоў таму (1939) нарадзілася Мархель Таццяна Рыгораўна, актрыса, заслужаная артыстка Беларусі. У 1970–1986 гг. працавала ў тэатры імя Я. Коласа.

20 студзеня – 95 гадоў таму (1919) пачаліся заняткі ў майстэрні М. Шагала ў Народным вучылішчы г. Віцебска.

20 студзеня – 70 гадоў таму (1944) было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза ўдзельніку вызвалення Віцебшчыны ў гады Вялікай Айчыннай вайны Грыгор'еву Георгію Сцяпанавічу.

22 студзеня – 45 гадоў таму (1969) нарадзілася Целяпушкіна Алена Іванаўна, беларуская спартсменка (конны спорт, трохбор'е), майстар спорту Беларусі, сярэбраны прызёр міжнародных спаборніцтваў па трохбор'і, ураджэнка в. Карчэўшчына Сенненскага раёна.

23 студзеня – 105 гадоў таму (1909) нарадзіўся Ідаль Эдуард Антонавіч (парт. псеўданім Андрэй 1909–1938), дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Заходняй Беларусі, ураджэнец г. Віцебска.

23 студзеня – 95 гадоў таму (1919) ў Браславе адбылася першая канферэнцыя сялянскіх, рабочых і батрацкіх дэпутатаў.

23 студзеня – 55 гадоў таму (1959) нарадзіўся Каплякоў Сяргей Віктаравіч, беларускі спартсмен (плаванне вольным стылем), майстар спорту СССР міжнароднага класа, заслужаны майстар спорту СССР, чэмпіён XXII Алімпійскіх гульняў (1980 г.), сярэбраны прызёр XXI Алімпійскіх гульняў (1976 г.), прызёр чэмпіянатаў свету, чэмпіён Еўропы, ураджэнец г. Оршы.

25 студзеня – 90 гадоў таму (1924) ў Віцебску адкрыты Прамысловы банк.

25 студзеня – 55 гадоў таму (1959) нарадзіўся Вінніца Генадзь Рувімавіч, краязнавец, першы гісторык Аршанскага яўрэйскага таварыства, ураджэнец г. Оршы.

27 студзеня – 100 гадоў таму (1914) нарадзіўся Асмалоўскі Міхаіл Сцяпанавіч (1914–1977), беларускі архітэктар. У 1950 г. займаўся планіроўкай вёскі Лукомль Чашніцкага раёна.

28 студзеня – 95 гадоў таму (1919) ў Віцебску была адкрыта Народная мастацкая школа.

28 студзеня – 70 гадоў таму (1944) нарадзіўся Вінаградаў Міхаіл Кліменцьевіч, беларускі архітэктар, ураджэнец в. Навасады Чашніцкага раёна.

29 студзеня – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Баханькоў Арцём Яфімавіч (1924–2001), беларускі мовазнавец, доктар філалагічных навук, прафесар, ураджэнец в. Саламір'е Полацкага раёна.

30 студзеня – 105 гадоў таму (1909) нарадзіўся Генкін Абрам Львовіч (1909–2001), кандыдат тэхнічных навук, інжынер-віцэ-адмірал, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, ураджэнец г. Оршы.

30 студзеня – 90 гадоў таму (1924) ў Лепельскім раёне заснаваны Бярэзінскі дзяржаўны запаведнік.

30 студзеня – 85 гадоў таму (1929) нарадзіўся Клімаў Міхаіл Трафімавіч, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны настаўнік рабочай моладзі Беларусі. У 1960–1989 гг. працаваў на Аршанскім ільнокамбінаце.

КАСТРЫЧНІК

ХАЛІП

УЛАДЗІМІР ТРАФІМАВІЧ

Да 75-годдзя з дня нараджэння (1939)

Халіп Уладзімір Трафімавіч нарадзіўся 7 кастрычніка 1939 года ў вёсцы Двор Пліна Ушацкага раёна ў сялянскай сям'і. Беларускі драматург, мастацтвазнавец, празаік, публіцыст.

Пасля заканчэння сярэдняй школы працаваў у мясцовым калгасе. З 1957 г. – загадчык Плінскага сельскага клуба. У 1957–1963 гг. – студэнт аддзялення журналістыкі БДУ. У 1961–1964 гг. – літсупрацоўнік, загадчык аддзела рэдакцыі газеты «Чырвоная змена». У 1964–1965 гг. Уладзімір Трафімавіч служыў у Савецкай Арміі. Пасля звальнення ў запас зноў працаваў загадчыкам аддзела ў газеце «Чырвоная змена».

У 1965–1968 гг. Уладзімір Халіп вучыўся ў аспірантуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. У 1968–1970 гг. – уласны карэспандэнт газеты «Советская Белоруссия». У 1970–1972 гг. – інструктар аддзела культуры ЦК КПБ. У 1972–1981 гг. – галоўны рэдактар Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па кінематаграфіі. У 1981–1987 гг. – галоўны рэдактар сцэнарнай майстэрні кінастудыі «Беларусьфільм». З 1987 г. – мастацкі кіраўнік студыі дакументальных фільмаў «Летапіс». Абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Інсцэніроўка твораў беларускай мастацкай літаратуры».

У 1961 г. Уладзімір Трафімавіч дэбютаваў у друку аднаактовай п'есай «Адрачэнне». Ён выступае на старонках рэспубліканскіх

ЛІТАРАТУРА:

1. **Каўко, А. К.** Эпімах-Шыпіла Браніслаў Ігнатавіч / А. К. Каўко // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1987. — Т. 5. — С. 636.

2. **Кісялёў, Г. В.** Эпімах-Шыпіла Браніслаў / Г. В. Кісялёў, Т. М. Махнач // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А. В. Мальдзіса. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. — Т. 6. — С. 448—450.

3. **Кісялёў, Г.** Эпімах-Шыпіла Браніслаў Ігнатавіч / Г. Кісялёў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 2003. — Т. 6, кн. 2. — С. 267.

4. **Краснова, А.** Асветнік і выдавец / А. Краснова // Полацкі веснік. — 2004. — 8 чэрв. — С. 5.

5. **Краснова, А.** У пошуках страчанага часу / А. Краснова // Настаўніцкая газета. — 2001. — 26 мая. — С. 5.

6. **Эпимах-Шипила** Бронислав Игнатьевич // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 2008. — Т. 7. — С. 675.

7. **Януш, І.** Апякун і настаўнік Янкі Купалы / І. Януш // Лепельскі край. — 2002. — 22 кастр. — С. 2.

ЛЮТЫ

95 гадоў таму (1919) сфарміравана Віцебская камісія па справах мастацтва і мастацкай прамысловасці.

90 гадоў таму (1924) ў Віцебску адкрылася калонія для непаўналетніх.

20 гадоў таму (1994) ў Оршы адкрыты помнік памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў, якія загінулі ў Афганістане.

2 лютага – 85 гадоў таму (1929) нарадзіўся Гоманаў Уладзімір Кірылавіч (1929–1998), беларускі мастак, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, ураджэнец г. Сянно.

2 лютага – 55 гадоў таму (1959) нарадзіўся Морхат Віктар Іосіфавіч (1959–2013), беларускі вучоны ў галіне афтальмалогіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, вынаходнік СССР, ураджэнец г. Віцебска. З 1983 г. працаваў у Віцебскім медыцынскім інстытуце.

4 лютага – 65 гадоў таму (1949) нарадзіўся Шапо Уладзімір Дзмітрыевіч, беларускі мастак, ураджэнец г. п. Відзы Браслаўскага раёна.

5 лютага – 125 гадоў таму (1889) нарадзіўся Хозераў Іван Макаравіч (1889–1947), расійскі і беларускі мастацтвазнавец, гісторык архітэктуры. Зрабіў графічную рэканструкцыю Спаса-Праабражэнскай царквы Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра, фрэскавыя роспісы ў г. Полацку і г. Віцебску.

6 лютага – 50 гадоў таму (1964) нарадзілася Беразоўская Таццяна Дзмітрыеўна, беларускі мастак, педагог, ураджэнка г. Віцебска.

7 лютага – 80 гадоў таму (1934) нарадзіўся Паўлаў Савелій Яфімавіч, пісьменнік, публіцыст, дзяржаўны дзеяч Беларусі, кандыдат гістарычных навук, прафесар Інстытута парламентарызму і прадпрымальніцтва, ураджэнец в. Самуйлы Браслаўскага раёна.

8 лютага – 110 гадоў таму (1904) нарадзіўся Лапо Аркадзь Іванавіч (1904–1983), беларускі вучоны-раслінавод, селекцыянер, ураджэнец в. Жданаўка Шумілінскага раёна.

8 лютага – 40 гадоў таму (1974) нарадзіўся Пілатаў Алег Мікалаевіч, беларускі спартсмен (гімнастыка спартыўная, кікбоксінг, тайландскі бокс), майстар спорту Беларусі па кікбоксінгу і тайландскаму боксу, сярэбраны прызёр чэмпіяната свету, бронзавы прызёр чэмпіяната Еўропы, чэмпіён СНД, чэмпіён Беларусі, ураджэнец г. Оршы.

9 лютага – 220 гадоў таму (1794) ў Віцебску пры Народным вучылішчы адкрыта першая бібліятэка.

9 лютага – 95 гадоў таму (1919) нарадзіўся Сцёпін Віктар Аляксандравіч (1919–2007), ваенны дзеяч, удзельнік вызвалення Шумілінскага і Бешанковіцкага раёнаў у Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза.

10 лютага – 90 гадоў таму (1924) ў сувязі з першым узбуйненнем БССР была ліквідавана Віцебская губерня, частка якой была перададзена Пскоўскай губерні РСФСР.

11 лютага – 95 гадоў таму (1919) ў Віцебску арганізаваны сімфанічны аркестр.

сонца і ў наша аконца», кіраўнік студэнцкага Беларускага навукова-літаратурнага гуртка. У час Першай сусветнай вайны ўдзельнічаў у падрыхтоўцы «Меморыі прадстаўнікоў Беларусі на III канферэнцыі народаў» (Лазана, 1916), дзе абгрунтавана права беларускага народа на самастойнае нацыянальнае развіццё. З 1918 г. – старшыня навуковага аб’яднання «Таварыства вывучэння культурна-прамысловага стану Беларусі», садзейнічаў рабоце Белнацкома. З 1924 г. – правадзейны член Інбелкульта. З 1925 г. працаваў рэдактарам у Мінску. З 1927 г. – старшыня камісіі Інбелкульта па складанні слоўніка жывой беларускай мовы. 18 ліпеня 1930 года Браніслаў Ігнатавіч быў беспадстаўна арыштаваны, зняволены ў турму на 2 месяцы. Пасля вызвалення выехаў у Ленінград.

Эпімах-Шыпіла Браніслаў Ігнатавіч збіраў матэрыялы па гісторыі, этнаграфіі, фальклоры і літаратуры Беларусі. Складальнік унікальнай рукапіснай хрэстаматыі беларускай літаратуры (1881–1931), у якой сабраў тэксты многіх помнікаў беларускага пісьменства. У яго архіве доўгі час зберагаўся рукапісны зборнік Ф. Багушэвіча «Скрыпачка». Пры яго актыўным удзеле рабілася перавыданне твораў беларускіх класікаў, выданне 1-га беларускага альманаха-часопіса «Маладая Беларусь».

Браніслаў Ігнатавіч адыграў значную ролю ў жыцці і творчым станаўленні Я. Купалы. Эпімах-Шыпіла адрэдагаваў і падрыхтаваў да друку яго першы зборнік «Жалейка» (1908), захаваў у сваім архіве многія ненадрукаваныя творы паэта, склаў 2 машынапісныя сшыткі ненадрукаваных твораў Я. Купалы пецярбургскага перыяду (захоўваюцца ў музеі Я. Купалы ў Мінску). Пад рэдакцыяй Браніслава Ігнатавіча выйшлі «Віцебскі краёвы слоўнік» М. Каспяровіча (1927), «Краёвы слоўнік Чэрвеньшчыны» М. Шатэрніка (1929). У 1929 г. перадаў у АН БССР асабістую бібліятэку па беларусазнаўстве (5 тысяч тамоў).

Памёр 6 чэрвеня 1934 года ў ленінградскім шпіталі імя С. Пяроўскай.

ВЕРАСЕНЬ

ЭПІМАХ-ШЫПІЛА
БРАНІСЛАЎ ІГНАТАВІЧ
Да 155-годдзя з дня нараджэння (1859)

Эпімах-Шыпіла Браніслаў Ігнатавіч нарадзіўся 4 верасня 1859 года ў фальварку Будзькаўшчына Лепельскага павета (зараз – Полацкі раён). Дзеяч беларускай культуры, выдавец, фалькларыст, мовазнавец, літаратуразнавец.

Кандыдат гісторыка-філалагічных навук (1887). У 1880 г. Браніслаў Ігнатавіч скончыў Рыжскую Аляксандраўскую гімназію. У 1886 г. – Пецярбургскі ўніверсітэт. З 1887 г. – памочнік рэдактара перыядычнага выдання «Журнал Министерства путей сообщения», хатні настаўнік. У 1891–1925 гг. – памочнік дырэктара фундаментальнай бібліятэкі Пецярбургскага ўніверсітэта. Адначасова выкладаў старажытнагрэчаскую і лацінскую мовы ў шэрагу вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў Пецярбурга. Ганаровы член Віцебскай вучонай архіўнай камісіі, ад імя якой у 1896 г. удзельнічаў у археалагічным з’ездзе ў Рызе. У 1908 г. Браніслаў Ігнатавіч удзельнічаў у 1-м міжнародным з’ездзе бібліятэчных работнікаў у складзе расійскай дэлегацыі ў г. Бруселі.

У пачатку XX стагоддзя Браніслаў Ігнатавіч стаяў на чале беларускага культурнага руху ў Пецярбурзе. Прымаў удзел у дзейнасці культурна-асветніцкай арганізацыі «Круг беларускі» (1902–1904), ініцыятар стварэння (1906) і фактычны кіраўнік выдавецтва «Загляне

12 лютага – 105 гадоў таму (1909) нарадзіўся Іафінаў Самуіл Абрамавіч, вучоны ў галіне эксплуатацыі машынна-трактарнага парку, стваральнік навуковай школы, ураджэнец г. Віцебска.

12 лютага – 70 гадоў таму (1944) нарадзіўся Гіргель Сяргей Сяргеевіч, беларускі фізік, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, ураджэнец в. Цімошкава Міёрскага раёна.

14 лютага – 110 гадоў таму (1904) нарадзіўся Нікалаевіч Аляксей Мікалаевіч (1904–1965), военачальнік, генерал-лейтэнант, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец в. Астроўна Бешанковіцкага раёна.

14 лютага – 65 гадоў таму (1949) нарадзіўся Яроменка Мікалай Мікалаевіч (1949–2001), акцёр тэатра і кіно, кінарэжысёр, народны артыст Расіі, лаўрэат прэміі УЛКСМ, ураджэнец г. Віцебска.

15 лютага – 55 гадоў таму (1959) нарадзіўся Васючэнка Пётр Васілевіч, празаік, крытык, літаратуразнавец, драматург, ураджэнец г. Полацка.

17 лютага – 95 гадоў таму (1919) нарадзілася Кулакоўская Тамара Нікандраўна (1919–1986), беларускі вучоны ў галіне аграхіміі і глебазнаўства, член-карэспандэнт НАН Беларусі, акадэмік УАСГНІЛ, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнка г. Полацка.

17 лютага – 95 гадоў таму (1919) нарадзіўся Сяржантаў Іван Якаўлевіч (1919–1943), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Якаўлевічы Аршанскага раёна.

17 лютага – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Янчанка Сцяпан Яфімавіч (1924–1999), беларускі вучоны-эканаміст, доктар эканамічных навук, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі, ураджэнец в. Анціпенкі Дубровенскага раёна.

17 лютага – 80 гадоў таму (1934) заснаваны вучгас "Падбярэззе" Віцебскай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

17 лютага – 60 гадоў таму (1954) нарадзіўся Шарай Рыгор Сцяпанавіч, краязнавец, ураджэнец г. Оршы.

18 лютага – 135 гадоў таму (1879) нарадзіўся Каржанеўскі Мікалай Леапольдавіч (1879–1958), географ, гляцыёлаг, ураджэнец Віцебскай губерні.

22 лютага – 310 гадоў таму (1704) нарадзіўся Вяжбіцкі (Вяржбіцкі) Казімір Юзаф (1704–1755), каталіцкі рэлігійны дзеяч, педагог, прафесар Віленскай акадэміі, ураджэнец Віцебскага ваяводства.

23 лютага – 95 гадоў таму (1919) нарадзіўся Казлоў Арсен Яўхімавіч (1919–1971), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Газьба Гарадоцкага раёна.

23 лютага – 95 гадоў таму (1919) нарадзіўся Саевіч Цімафей Аляксандравіч (1919–2003), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза. Ваяваў пад г. Віцебскам, г. Полацкам.

присвоено звание Героя Советского Союза 31 августа 1941 года посмертно.

Награжден орденом Ленина.

Именем Бориса Хигрина названы улицы в г. Орше и г. п. Белыничи. На месте гибели капитана установлен памятник – пушка с мемориальной доской. Его имя навечно занесено в списки воинской части.

ЛИТЕРАТУРА:

1. **Хигрин** Борис Львович // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 2008. — Т. 7. — С. 411.

2. **Хигрин** Борис Львович // Слава и гордость земли Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич (пред.) [и др.]. — Витебск : Витеб. обл. тип., 2009. — С. 140.

3. **Хігрын** Барыс Львовіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн, 2003. — Т. 17. — С. 17.

4. **Хігрын** Барыс Львовіч // Памяць : Орша. Аршанскі раён : у 2 кн. : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; уклад. Т. Г. Ігнацьева [і інш.] ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : БелЭн, 1999. — Кн. 1. — С. 374.

5. **Юркевич, В.** Рожденные стать героями / В. Юркевич // Телеком-экспресс (Орша). — 2010. — 14 янв. — С. 10.

ХИГРИН
БОРИС ЛЬВОВИЧ
К 105-летию со дня рождения (1909)

Хигрин Борис Львович родился 14 августа 1909 года в г. Орше в семье рабочих. Герой Советского Союза (1941).

Окончил рабфак. Работал фрезеровщиком на первом Московском деревоотделочном заводе. С 1931 г. – в Красной Армии. В 1933 г. окончил Московскую артиллерийскую школу. В 1939 г. – участник освободительного похода советских войск в Западную Украину и Западную Белоруссию.

С июня 1941 г. – на фронте Великой Отечественной войны. 5 июля 1941 г. дивизион 462-го артиллерийского полка (13-я армия, Западный фронт) под командованием капитана Хигрина принял неравный бой на левом берегу реки Друть около г. п. Белыничи, что на шоссе Минск – Могилев. Немцы атаковали позиции артдивизиона, но безуспешно. После этого около 40 танков с фашистской свастикой опять перешли в наступление. Силы были неравные, но советские воины вступили в бой. Когда у одного артиллерийского расчета погибли командир и наводчик, то капитан сам стал у орудия и подбил четыре танка противника. Было уничтожено много боевой техники и живой силы, что дало возможность советским войскам занять оборону на восточном берегу реки Друть. Офицер-артиллерист погиб в этом бою. Похоронен в г. п. Белыничи.

Хигрину Борису Львовичу, третьему артиллеристу страны,

23 лютага – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Жданко Рыгор Сямёнавіч (1924–1987), дзяржаўны дзеяч Беларусі, ураджэнец в. Крукоўшчына Ушацкага раёна.

25 лютага – 115 гадоў таму (1899) нарадзіўся Макавецкі Фёдар Яфрэмавіч (1899–1974), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Багданаўка Талачынскага раёна.

25 лютага – 100 гадоў таму (1914) нарадзіўся Лузгін Васіль Іванавіч (1914–1998), партыйны і дзяржаўны дзеяч Беларусі, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў камсамольска-маладзёжнага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Дрымаўшчына Чашніцкага раёна.

26 лютага – 95 гадоў таму (1919) ва Ушачах адкрылася польская нацыянальная школа.

28 лютага – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Кандрашоў Пётр Пятровіч (1924–1998), Герой Сацыялістычнай Працы. Працаваў у галіне сельскай гаспадаркі Віцебскай вобласці.

САКАВІК

75 гадоў таму (1939) адкрыты Віцебскі абласны Дом народных мастацтваў. З 1980 г. – абласны навукова-метадычны Цэнтр народнай творчасці і культурна-выхаваўчай работы.

1 сакавіка – 85 гадоў таму (1929) нарадзілася Лось Еўдакія Якаўлеўна (1929–1977), паэтэса, ураджэнка в. Старына Ушацкага раёна.

1 сакавіка – 25 гадоў таму (1989) заснаваны Аршанскі музей гісторыі і культуры горада – філіял установы культуры "Музейны комплекс гісторыі і культуры Аршаншчыны".

3 сакавіка – 95 гадоў таму (1919) нарадзілася Маршалава Еўфрасіння Яфрэмаўна (1919–2002), Герой Сацыялістычнай Працы, былая звеннявая калгаса імя XX з'езда КПСС Дубровенскага раёна.

3 сакавіка – 95 гадоў таму (1919) пачаў работу першы губернскі з'езд камсамола.

3 сакавіка – 85 гадоў таму (1929) нарадзілася Супрун Лідзія Якаўлеўна, беларускі вучоны ў галіне акушэрства і гінекалогіі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі. З 1962 г. працавала ў Віцебскім медыцынскім універсітэце.

4 сакавіка – 65 гадоў таму (1949) ў Глыбоцкім раёне заснаваны калгас "1 Мая". Зараз – СВК "Сельцы".

4 сакавіка – 65 гадоў таму (1949) ў Міёрскім раёне заснаваны калгас "Кастрычніцкая рэвалюцыя". Зараз СВК – "Перабродцдзе".

4 сакавіка – 65 гадоў таму (1949) нарадзіўся Собаль Валянцін Енісеевіч, археолаг, кандыдат гістарычных навук, ураджэнец г. Паставы.

5 сакавіка – 100 гадоў таму (1914) нарадзіўся Філіпенка Леанід Мікалаевіч (1914–2012), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, Ганаровы грамадзянін г. Віцебска.

5 сакавіка – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Клімчанка Яўген Іванавіч (1924–1989), Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны работнік прамысловасці Беларусі, заслужаны настаўнік рабочай моладзі, ураджэнец в. Лагаўшчына Талачынскага раёна.

ЛИТЕРАТУРА:

1. **Исаков, Г. П.** Витебский музей современного искусства. Художественные выставки в Витебске в 1919—1922 гг. / Г. П. Исаков // Формирование и становление художественных школ на Витебщине в конце XIX в. — 1941 г. : пособие / Г. П. Исаков. — Витебск : ВГУ им. П. М. Машерова, 2009. — С. 45—48.

2. **Михневич, Л.** К вопросу об истории Витебского музея современного (левого) искусства / Л. Михневич // Малевич. Классический авангард. Витебск : [альманах] / ред. Т. Котович. — Мн. : Экономпресс, 2009. — Вып. 11. — С. 65—79.

3. **Новае** пра малавядомае // Краязнаўчая газета. — 2008. — № 33 (верас.). — С. 2.

4. **Шишанов, В. А.** Витебский музей современного искусства : история создания и коллекции (1918—1941) / В. А. Шишанов. — Мн. : Медисонт, 2007. — 144 с.

5. **Шишанов, В.** «За недостатком подходящего помещения...» / В. Шишанов // Віцьбічы = Витьбичи. — 2012. — 30 авг. — С. VI.

Судьба музея сложилась незавидно — коллекции, насчитывавшей уже около 150 произведений, не нашлось подходящего помещения. С 18 июля по конец августа 1920 года работы экспонировались в здании художественного училища, после чего «музей был свернут, ибо помещение должно было быть использовано для открытия новой живописной мастерской». На заседаниях Комиссии по охране памятников положение «Витебского музея новейших художников» характеризовалось как «ужасное» и «печальное» – экспонаты были свалены в маленькой комнатке училища. Опасаясь за судьбу картин, перебравшиеся в 1922 году в Петроград Казимир Малевич и приверженцы его учения вывезли 22 работы, которые оказались в фондах Музея живописной культуры, а после его ликвидации в 1926-м пополнили собрание Русского музея.

Осенью 1924 года в правление Витебского общества краеведения и окроно поступили сведения о том, что картины левых художников режутся на холсты для работ учащихся художественного техникума. Это обстоятельство послужило началом продолжительного разбирательства, в результате которого уцелевшие 32 работы были переданы в краеведческий музей и некоторые из них находились в экспозиции до середины 1930-х годов. В 1939-м часть картин перевезли в Минск для создававшейся государственной картинной галереи БССР (нынешнего Национального художественного музея).

С началом Великой Отечественной войны фонды Витебского краеведческого музея были эвакуированы в Саратов. После возвращения из коллекции бывшего музея современного искусства остался только натюрморт Штеренберга.

Помимо этого, сейчас известно местонахождение еще 26 произведений: 19 из них находятся в Государственном Русском музее, 6 – в Национальном художественном музее Беларуси и одно – в Музее современного искусства Кавамура в Японии!

Нам же остается сожалеть, что Витебск лишился замечательного собрания, которым мы могли бы гордиться…

6 сакавіка – 145 гадоў таму (1869) нарадзіўся Арленеў Павел Мікалаевіч (сапр. Арлоў 1869–1932), рускі акцёр. У 1889–1890 гг. у складзе рускай тэатральнай трупы працаваў у г. Полацку.

6 сакавіка – 55 гадоў таму (1959) ў Віцебску адкрыўся ўнівермаг.

6 сакавіка – 50 гадоў таму (1964) нарадзіўся Міхно Уладзімір Фёдаравіч, журналіст, пісьменнік, ураджэнец Лепельскага раёна.

7 сакавіка – 90 гадоў таму (1924) Віцебск наведаў рускі пісьменнік А. М. Талстой.

7 сакавіка – 70 гадоў таму (1944) ў Віцебску адкрыўся абласны Дом дзіцяці.

8 сакавіка – 85 гадоў таму (1929) нарадзіўся Крэмень Анатоль Сцяпанавіч, Герой Сацыялістычнай Працы, заслужаны будаўнік Беларусі, былы будаўнік Віцебскага будаўнічага трэста № 9, наваполацкага трэста № 16.

9 сакавіка – 110 гадоў таму (1904) нарадзіўся Дзежыц Валянцін Канстанцінавіч (1904–1964), беларускі жывапісец, педагог, выкладчык Віцебскага мастацкага вучылішча (1931–1941 гг.), выкладчык Віцебскага педагагічнага інстытута (1948–1964 гг.).

9 сакавіка – 85 гадоў таму (1929) ліквідаваны Валынецкі раён у Полацкай акрузе.

9 сакавіка – 85 гадоў таму (1929) створаны Боркавіцкі раён. Існаваў да 08.07.1931 г.

11 сакавіка – 100 гадоў таму (1914) нарадзіўся Крапцоў-Зайчанка Мікалай Васільевіч (1914–1944), удзельнік вызвалення Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза.

11 сакавіка – 60 гадоў таму (1954) нарадзілася Лазаковіч Тамара Васільеўна (1954–1992), беларуская спартсменка (спартыўная гімнастыка), заслужаны майстар спорту СССР, чэмпіёнка XX Алімпійскіх гульняў (1972 г.), чэмпіёнка свету, абсалютная чэмпіёнка Еўропы, абсалютная чэмпіёнка V Спартакіяды народаў СССР, чэмпіёнка СССР. З 1976 г. дзяржаўны трэнер СССР па Віцебскай вобласці.

12 сакавіка – 185 гадоў таму (1829) нарадзіўся Грабніцкі Отан Мікалаевіч (1829–1865), удзельнік паўстання 1863–1864 гг. на Беларусі, ураджэнец Лепельскага раёна.

12 сакавіка – 80 гадоў таму (1934) нарадзіўся Аўдошка Мікалай Пятровіч (1934–1979), Герой Сацыялістычнай Працы. У 1954–1957 гг. працаваў у Ветрынскім райкаме КПБ.

12 сакавіка – 60 гадоў таму (1954) праведзены збор камсамольскага актыву г. Віцебска, прысвечаны адпраўцы першых 180 камсамольцаў у Казахстан для асваення цалінных земляў.

15 сакавіка – 60 гадоў таму (1954) адкрыты вячэрні тэхнікум пры Аршанскім ільнокамбінаце.

15 сакавіка – 50 гадоў таму (1964) адкрыты Віцебскі палітэхнікум.

16 сакавіка – 75 гадоў таму (1939) нарадзіўся Лабуноў Уладзімір Архіпавіч, вучоны ў галіне мікраэлектронікі, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны вынаходнік Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнец г. Оршы.

Наркомпроса. К тому же, на работе отсутствует авторская подпись...

Только обнаруженные в архивах списки картин с номерами, совпадавшими с имеющимися на обороте натюрморта, позволили подтвердить, что это действительно произведение Давида Штеренберга. И это единственная картина, оставшаяся в Витебске от собрания Музея современного (левого) искусства.

Идея создания музея принадлежит Марку Шагалу. Еще в конце августа 1918 года известный уроженец Витебска подал в Наркомпрос проект о создании в городе художественной школы и музея. Художник считал, что и в провинции люди должны иметь возможность развивать свои творческие способности, изучая лучшие образцы искусства различных эпох и направлений. В те годы эта идея активно поддерживалась «центром», и был сформирован фонд картин, которые должны были распределяться для создания широкой сети музеев. Заявка из Витебска поступила одной из первых, и в августе 1919 года 29 работ 12 авторов были привезены художником Абрамом Бразером в город на Двине. Среди них были произведения П. Кончаловского, К. Малевича, М. Ле-Дантю, О. Розановой, Р. Фалька и других уже известных мастеров нового искусства. Коллекция музея пополнялась за счет закупок у местных художников А. Бразера, А. Ромма, Ю. Пэна, М. Шагала. Параллельно формировалась коллекция лучших работ учеников художественного училища.

В мае 1920 года Марк Шагал лично доставил еще 26 работ, среди авторов которых были М. Ларионов, К. Коровин, Н. Альтман, А. Родченко, В. Кандинский, А. Шевченко. В этом поступлении оказался и натюрморт Д. Штеренберга «Письменный стол».

Однако Шагала ждал неприятный сюрприз – на дверях класса, где он проводил занятия, появилась надпись «Мастерская Малевича». «Распропагандированные» Казимиром Малевичем и его сторонниками учащиеся в полном составе перешли в «лагерь супрематизма». Это стало последней точкой в череде конфликтов и обид, заставивших Марка Шагала, как оказалось, навсегда покинуть свой родной город.

раёнаў Беларусі / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; уклад. А. В. Скараход ; маст. Э. Э. Жакевич. — Мн. : БелЭн, 2004. — С. 619.

2. **Генадзьева, В.** Карціны з гарышча, прыгажосць з закуткоў, жыццё — з натуры / В. Генадзьева // Родныя вытокі (Докшыцы). — 2001. — 7 крас. — С. 2.

3. **Круковіч, Н.** Выхадцы з Докшыц у рэспубліканскіх выставах / Н. Круковіч // Родныя вытокі (Докшыцы). — 2009. — 26 жн. — С. 4.

4. **Сауліч, У.** «Прывітанне» з 37-га года / У. Сауліч // Віцебскі рабочы. — 2001. — 24 мая. — С. 2.

5. **Шпакоўская, Г.** Імгненні збеглага ў нябыт стагоддзя... / Г. Шпакоўская // Народнае слова. — 2006. — 26 кастр. — С. 13.

ЖНІВЕНЬ

ВИТЕБСКИЙ МУЗЕЙ СОВРЕМЕННОГО ИСКУССТВА

К 95-летию со дня образования (1919)

Старые сотрудники краеведческого музея вспоминали, что эту картину неоднократно показывали приезжавшим в Витебск искусствоведам с вопросом: «Это может быть работой Давида Штеренберга?». Но в покрытом патиной времени небольшом куске фанеры с абстрактным изображением письменного стола с чернильницей, перьевой ручкой, пресс-папье в «творческом беспорядке» трудно было узнать авторство известного художника начала XX века, возглавлявшего в первые послереволюционные годы отдел изобразительных искусств

16 сакавіка – 20 гадоў таму (1994) ў Віцебску скончыла сваю дзейнасць мастацкае аб'яднанне "Квадрат".

17 сакавіка – 225 гадоў таму (1789) нарадзіўся Бучынскі Вінцэнцій (1789–1853), філосаф, тэолаг, крытык, заснавальнік і рэдактар першага на Беларусі літаратурна-навуковага часопіса "Полацкі штомесячнік" (1818–1820 гг.), выкладчык Полацкай езуіцкай акадэміі.

17 сакавіка – 25 гадоў таму (1989) ў Оршы адкрыта гарадская выставачная зала.

18 сакавіка – 110 гадоў таму (1904) нарадзіўся Франкфурт Аляксандр Ізраілевіч (1904–1977), беларускі вучоны ў галіне ўнутранай медыцыны. З 1959 г. працаваў у Віцебскім медыцынскім інстытуце.

18 сакавіка – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Бяляўскі Васіль Мікалаевіч (1924–2008), беларускі мастак, ураджэнец в. Крашына Аршанскага раёна.

18 сакавіка – 70 гадоў таму (1944) нарадзілася Харытончык Зінаіда Андрэеўна, беларускі мовазнаўца, доктар філалагічных навук, прафесар, ураджэнка г. Дзісны Міёрскага раёна.

20 сакавіка – 125 гадоў таму (1889) нарадзіўся Родзевіч Часлаў Іванавіч (1889–1942), беларускі грамадскі дзеяч, збіральнік і прапагандыст фальклору. Уваходзіў у Першую беларускую трупу Ігната Буйніцкага.

21 сакавіка – 65 гадоў таму (1949) быў створаны калгас імя Свярдлова Глыбоцкага раёна. Зараз – СВК "Галубічы".

22 сакавіка – 65 гадоў таму (1949) быў створаны калгас імя Чапаева Глыбоцкага раёна. Зараз – СВК "Верхняе".

23 сакавіка – 100 гадоў таму (1914) нарадзілася Плыгаўка Лідзія Пятроўна (1914–1999), Герой Сацыялістычнай Працы, былая звеннявая калгаса "Парыжская камуна" Глыбоцкага раёна.

23 сакавіка – 85 гадоў таму (1929) нарадзіўся Шпакаў Аляксей Пракоф'евіч, беларускі вучоны ў галіне заатэхніі. Працуе ў Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны.

23 сакавіка – 65 гадоў таму (1949) нарадзіўся Ласкаўнёў Аляксандр Пятровіч, беларускі вучоны ў галіне матэрыялазнаўства, ураджэнец г. п. Расоны.

23 сакавіка – 35 гадоў таму (1979) нарадзілася Бараноўская Наталля Сяргееўна, беларуская спартсменка (плаванне вольным стылем), майстар спорту СССР міжнароднага класа, бронзавы прызёр чэмпіяната свету, чэмпіёнка Еўропы, ураджэнка г. Віцебска.

25 сакавіка – 20 гадоў таму (1994) ў Полацку заснаваны Музей-бібліятэка Сімяона Полацкага.

26 сакавіка – 115 гадоў таму (1899) нарадзіўся Бладыка Нічыпар Міхайлавіч, беларускі педагог, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, ураджэнец в. Рамашкіна Талачынскага раёна.

26 сакавіка – 65 гадоў таму (1949) быў створаны калгас імя Цітова Міёрскага раёна. Зараз – СВК "Цітова".

горада. Многія партрэты маляваліся на продаж, каб заплаціць за майстэрню і набыць фарбы. Партрэты Вішнеўскага вылучаюцца глыбокім псіхалагізмам. Пазіравалі мастаку паны, просты люд, дзеці і старыя. Ізноў жа іх вачыма глядзіць на нас адышоўшая «натура». Іх абліччы, увекавечаныя чуйнай рукою мастака, падсвечаныя яго душой, працягваюць жыць у новым стагоддзі. Кожны партрэт – гэта непасрэдны кантакт творцы і натуры.

У 1940–1941 гг., 1944–1951 гг. Сяргей Антонавіч выкладаў маляванне ў Докшыцкай сярэдняй школе. Фатаграфіяй на сталай аснове заняўся пасля Вялікай Айчыннай вайны. У 1950 г. абсталяваў студыю ў прыбудове да аднаго са старых дамоў у цэнтры г. Докшыцы. У фотаатэлье дзеля натуральнага асвятлення над ёй быў зроблены шкляны дах. Героі здымкаў памятаюць візіты ў студыю Вішнеўскага як нешта незвычайнае для той пары. Чаго толькі не было там – дэкарацыі, цацкі, кветкі. А як рабіўся здымак «на прыродзе», то і тады для антуражу знаходзілася жывое казлянятка, трусік ці гуска. У той час цяжка было абысціся без рэтушы. Падпраўляў фотаздымкі і Сяргей Антонавіч, але зроблена гэта тонка, незаўважна.

У другой палове 1960-х гг. студыя пад шкляным дахам была знесена. Фотамайстэрню Сяргей Вішнеўскі зладзіў у сваёй хаце.

З 1960-х гг. пісаў пераважна краявідныя творы («Вясновы лес», «Дарога на Гняздзілава», «Дарога ў лесе», «Вясновы эцюд», «Восень», «Лес ля дарогі на Гняздзілава»), нацюрморты («Нацюрморт з грыбамі», «Нацюрморт з блакітнай вазай» і інш.), партрэты («Аўтапартрэт») і сюжэтныя кампазіцыі («Магдалена, якая каецца»). Маляваў абразы для докшыцкай царквы.

Памёр 19 жніўня 1992 года.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Гаранская, Т. Г.** Вішнеўскі Сяргей Антонавіч / Т. Г. Гаранская // Памяць : Докшыцкі раён : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і

ВІШНЕЎСКІ
СЯРГЕЙ АНТОНАВІЧ
Да 105-годдзя з дня нараджэння (1909)

Вішнеўскі Сяргей Антонавіч нарадзіўся 18 ліпеня 1909 года ў г. Шаўляй (Літва). Беларускі мастак, мастак-афарміцель, фатограф.

Спачатку вучыўся ў агульнаадукацыйнай школе ў г. Докшыцы. З дзяцінства захапляўся маляваннем.

Пры падтрымцы Людвіка Слатвінскага, уладальніка маёнтка ў в. Гняздзілава Докшыцкага раёна, здольны да малявання хлопец у 1934 годзе паступіў у Віленскую мастацкую вучэльню імя Адама Міцкевіча. У той час там вялі заняткі вядомыя мастакі. Адзін з іх, прафесар Марыян Кулеша, вучыўся ў Кракаве і Варшаве, потым закончыў акадэмію мастацтваў у Пецярбурзе. Яго вучні вывучалі пластычную анатомію і жывапіс, атрымліваючы моцную і своеасаблівую акадэмічную школу. Абрысы будучай выявы не наносіліся на палатно алоўкам ці вугалем – вучні адразу працавалі пэндзлем. Палітра наўмысна была вельмі сціплай, усяго некалькі фарбаў. У час вучобы ў Вільні Сяргей Вішнеўскі меў невялікую майстэрню, дзе жыў і меў магчымасць займацца вучобай і творчасцю.

На канікулах Сяргей Антонавіч мог працягваць заняткі жывапісам у вёсцы Гняздзілава. Слатвінскія выдзялілі яму памяшканне. Яны адчувалі здольнасці юнака і садзейнічалі іх сталаму развіццю.

Дыпломнай працай па жывапісе была фігура чалавека ў пейзажы

26 сакавіка – 65 гадоў таму (1949) нарадзіўся Казаравец Мікалай Уладзіміравіч, беларускі вучоны ў галіне жывёлагадоўлі, член-карэспандэнт НАН Беларусі, доктар сельскагаспадарчых навук, прафесар, ураджэнец в. Харкі Пастаўскага раёна.

26 сакавіка – 60 гадоў таму (1954) быў створаны калгас "Маладая гвардыя" Міёрскага раёна. Зараз – СВК "Гвардзейскі".

26 сакавіка – 60 гадоў таму (1954) нарадзілася Катовіч Таццяна Віктараўна, беларускі тэатразнаўца, педагог, доктар мастацтвазнаўства, прафесар, ураджэнка г. Віцебска.

27 сакавіка – 60 гадоў таму (1954) нарадзіўся Піменаў Васіль Васільевіч (1954–2005), удзельнік вайны ў Афганістане, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Віцебска.

28 сакавіка – 55 гадоў таму (1959) нарадзіўся Навуменка Якаў Паўлавіч, беларускі эстрадны спявак, заслужаны артыст Беларусі, ураджэнец г. Оршы.

30 сакавіка – 120 гадоў таму (1894) нарадзіўся Зарака-Заракоўскі Баляслаў Францавіч (1894–1963), генерал-лейтэнант, удзельнік Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ураджэнец г. Полацка.

КРАСАВІК

95 гадоў таму (1919) пачала выдавацца газета "Известия Городокского исполнительного комитета Совета рабочих и крестьянских депутатов". З 1991 г. – "Гарадоцкі веснік".

1 красавіка – 180 гадоў таму (1834) нарадзіўся Забелін Іосіф Вікенцьевіч (1834–1875), вучоны-медык, ураджэнец Віцебскай губерні.

1 красавіка – 55 гадоў таму (1959) быў створаны калгас "Белае" Полацкага раёна.

2 красавіка – 80 гадоў таму (1934) нарадзіўся Зуеў Юрый Панцеляймонавіч, беларускі мастак. Жыве ў г. Віцебску.

3 красавіка – 95 гадоў таму (1919) адкрыўся 1-ы губернскі з'езд настаўнікаў і работнікаў народнай адукацыі.

3 красавіка – 85 гадоў таму (1929) прынята пастанова Віцебскага выканкама "Аб электрыфікацыі Віцебскага раёна ў сувязі з пускам Асінстроя".

4 красавіка – 110 гадоў таму (1904) нарадзіўся Кашыра Юрый Фадзеевіч (1904–1943), беларускі рымска-каталіцкі святар, ураджэнец в. Александрова Міёрскага раёна.

5 красавіка – 125 гадоў таму (1889) нарадзіўся Кардовіч Іосіф Мітрафанавіч (1889–1967), адзін з арганізатараў і кіраўнікоў антыфашысцкага падполля і партызанскага руху на тэрыторыі Магілёўскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, ураджэнец в. Друцк Талачынскага раёна.

5 красавіка – 95 гадоў таму (1919) нарадзіўся Рамашкін Цімафей Цярэнцьевіч (1919–1945), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Марчанкі Гарадоцкага раёна.

6 красавіка – 65 гадоў таму (1949) прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы звеннявой-ільнаводу калгаса "Расоны" Ганне Савельеўне Гарэцкай.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Гніламёдаў, У.** Вольга Русілка і паэты яе пакалення / У. Гніламёдаў // Полымя. — 2009. — № 7. — С. 136—145.

2. **Русецкі, А. У.** І каханне, і горыч, і боль... / А. У. Русецкі // Лёсы. Людзі. Літаратура / А. У. Русецкі. — Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2008. — С. 208—211.

3. **Русілка, В.** У нас такое прымавіско... : мініяцюры / В. Русілка // Літаратура і мастацтва. — 2010. — 12 лют. — С. 9.

4. **Русілка, В. І.** Узняцца над будзённасцю / В. І. Русілка ; гутарыла Г. Шпакоўская // Народнае слова. — 2012. — 9 кастр. — С. 4.

5. **Русілка** Вольга // Пісьменнікі Віцебшчыны : даведнік / рэд. Ф. Сіўко. — Віцебск : Віцеб. абл. друк., 2001. — С. 67—68. — (Віцебшчына літаратурная).

6. **Фенчанка, Н.** «На дарогі нанізваю пацеркі лёсу...» / Н. Фенчанка // Віцьбічы = Витьбичи. — 2009. — 19 сент. — С. 12.

аркестравую фанаграму і развучвала песні з выканаўцамі.

У 2004 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» быў выдадзены другі зборнік лірыкі паэткі «Ажына». Няздзейсненыя жаданні і мары, бяздумнасць тых, хто «лёгка адрываецца зялёным лістком ад дрэва бацькоўскага дома», заўсёднае прадчуванне болю, нетрываласць пачуццяў – вось асноўны тэматычны напрамак гэтай кнігі. Акрамя таго, Вольга Іванаўна прыпамінае сваё бесклапотнае студэнцтва, калі быў знаёмы «пах кавярань у сталіцы» і «не паспееш нават надзівіцца, як “на раён” шляхі цябе завуць»...

Вольга Русілка з'яўляецца адным з аўтараў альманахаў «Дзвіна: Віцебшчына літаратурная» (1992, 2000, 2005, 2009 гады), зборнікаў «Шчаслівы дзень» (на беларускай і грузінскай мовах, 1983), «Квадра» (1990), «Вёсны» (1997), «Валожыншчына літаратурная» (2006), «Литературный Брянск» (у перакладзе Т. Красновай-Гусачэнкі, 2006), «Факультэт паэзіі» (2007).

Вольга Іванаўна актыўна займаецца і перакладчыцкай дзейнасцю. Так, у 1999 годзе Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Я. Коласа паставіў спектакль «Чума на вашы дзве сям'і» па п'есе Р. Горына ў перакладзе паэтэсы.

За шматлікія поспехі ў галіне літаратуры, адказную педагагічную і грамадскую дзейнасць Вольга Іванаўна Русілка ўзнагароджана Ганаровай граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, знакам «Выдатнік адукацыі». Паэтка – лаўрэат абласной літаратурнай прэміі імя У. Караткевіча.

Вольга Русілка лічыць, што ў кожнай жанчыне ёсць лірыка, і кожная жанчына, па сутнасці, паэтка, бо прыгажосць ідзе менавіта ад слабай паловы чалавецтва. Сапраўды, гэта яна паставіла яшчэ ў пячоры першую кветку, а скуры аздобіла вышыванкай. Жанчыны ўратуюць Свет. А лірычны настрой дапамагае ім у гэтай пачэснай справе. Паэзія ратуе ад самоты, абыякавасці, няўцешнасці. Будзем спадзявацца, у хуткім часе Вольга Іванаўна парадуе прыхільнікаў сваёй творчасці нараджэннем новых вершаў, паўнюткіх дабрыні і пяшчоты.

8 красавіка – 115 гадоў таму (1899) нарадзіўся Галуза Іларыён Рыгоравіч (1899–1977), вучоны ў галіне заалогіі і паразіталогіі, акадэмік АН Казахстана, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, ураджэнец Сенненскага раёна.

9 красавіка – 100 гадоў таму (1914) нарадзіўся Шчарбіна Васілій Васільевіч (1914–1942), удзельнік партызанскага руху на тэрыторыі Віцебскай вобласці ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза.

11 красавіка – 70 гадоў таму (1944) пачалася Полацка-Лепельская бітва 1944 г. – баі партызанскіх брыгад Полацка-Лепельскай партызанскай зоны супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў у Вялікую Айчынную вайну. Працягвалася да 15.05.1944 г.

12 красавіка – 110 гадоў таму (1904) нарадзілася Лі Соф'я Дзмітрыеўна (1904–1980), беларуская мастачка, ураджэнка в. Обаль Сенненскага раёна.

12 красавіка – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Цвярскі Аляксандр Давыдавіч, пісьменнік, член Саюза пісьменнікаў СССР, ураджэнец г. Віцебска.

13 красавіка – 110 гадоў таму (1904) нарадзіўся Модэль Міхась (сапр. Мендэль Моўшавіч 1904–1980), пісьменнік, крытык, тэатразнавец, ураджэнец в. Камень Лепельскага раёна.

14 красавіка – 105 гадоў таму (1909) нарадзіўся Аляксееў Іван Епіфанавіч (1909–1943), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Полацка.

15 красавіка – 95 гадоў таму (1919) Віцебск наведала руская актрыса Ярмолава М. М. (1853–1928).

17 красавіка – 95 гадоў таму (1919) нарадзіўся Гапяёнак Мікалай Іванавіч (1919–2008), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Глінішча Гарадоцкага раёна.

17 красавіка – 95 гадоў таму (1919) нарадзіўся Пахомаў Мікалай Ільіч (1919–1988), удзельнік партызанскага руху, журналіст, гісторык, ураджэнец в. Вольшчына Гарадоцкага раёна.

18 красавіка – 105 гадоў таму (1909) нарадзіўся Ран Лазар Саулавіч (1909–1989), графік, жывапісец. У 1932 г. скончыў Віцебскі мастацкі тэхнікум.

20 красавіка – 115 гадоў таму (1899) заснавана Віцебскае таварыства апекі над дзецьмі.

22 красавіка – 75 гадоў таму (1939) нарадзіўся Атрашкевіч Валерый Іосіфавіч (1939–1990), беларускі літаратуразнавец, кандыдат філалагічных навук, ураджэнец в. Красная Горка Ушацкага раёна.

22 красавіка – 45 гадоў таму (1969) быў створаны саўгас "Касары" Ушацкага раёна.

23 красавіка – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Шалуха Барыс Фёдаравіч (1924–2003), краязнавец, педагог, ураджэнец в. Заложжа Аршанскага раёна.

25 красавіка – 65 гадоў таму (1949) нарадзіўся Іваноў Уладзімір Усцінавіч, беларускі акварэліст, дырэктар Віцебскага камбіната "Мастацтва" (1988–1992 гг.), старшыня Віцебскага абласнога аддзялення Беларускага саюза мастакоў (1995–2001 гг.), ураджэнец в. Мурожніца Шумілінскага раёна.

запамінальная. Чытаючы яе творы, як бы пераносішся ў тыя мясціны або абставіны, пра якія распавядае паэтэса, і перажываеш зноў боль ці радасць, пакуты ці шчасце разам з ёю.

Свой першы зборнік лірыкі, які пабачыў свет у 1996 годзе, Вольга Іванаўна назвала вельмі проста і даверліва – «Табе». Разам з тым, назва кнігі мае сімвалічнае значэнне: гэта жаданне на шчырасць адказаць шчырасцю, імкненне, каб цябе зразумелі. Азнакамленне з вершамі нясе прыхільнікам паэтычнага слова душэўную асалоду, радасць светаўспрымання, рамантычную ўзнёсласць. Праз вершы паэтка спавядаецца – перад сабой, чытачом, сумленнем. Шмат добрых слоў Вольга Іванаўна прысвяціла сваёй матулі. У іх прасочваецца непадробная любоў да самага дарагога чалавека на Зямлі. Яна ўдзячна мамачцы, што тая «ратавала ад самай дробязнай бяды» і вывела на «сцежку ад роднага дому». Трывога – вызначальная рыса свядомасці паэткі. Трывога за горкае каханне, за будучыню, за свой радавод, за родных і блізкіх («Ці прарасце маё слова-насенне…»).

Уся паэзія Вольгі Русілкі пранізана белым колерам – колерам чысціні, цнатлівасці і спагады. Гэты колер лечыць параненую душу і, разам з тым, увасабляе нашу памяць і спадзяванні. Свае адносіны да паэтычнай творчасці Вольга Іванаўна выказала ў наступных радках:

«Я вершаў не выспеўвала ніколі.
Яны прыходзілі, ратуючы мяне
Ад гора і ад горкае нядолі,
Што лёс, нажаль, ніяк не абміне».

Па словах самой паэткі, яна ніколі не піша пра палітыку, бытавыя праблемы. «Пішацца пра каханне, родны куток, пра тое, як хочацца разумення ў свеце, цяпла... У кожнага свая паэтычная дзялянка, у мяне – гэткая». Да некаторых вершаў зборніка «Табе» напісана музыка. Дапамагала вершаваным радкам набыць меладычную афарбоўку вядомы віцебскі кампазітар, выкладчыца музыкі і, увогуле, вельмі інтэлігентны і мудры чалавек Надзея Несцярэнка. Яна ж зрабіла аранжыроўку,

калектыўным зборніку «Вёсны».

Працоўную біяграфію Вольга Іванаўна пачала настаўніцай беларускай мовы і літаратуры ў СШ № 25 г. Віцебска, які стаў для яе другім домам і «... прарос у яе сэрцы». У 1981 годзе яна паступіла завочна ў аспірантуру пры Інстытуце літаратуры імя Янкі Купалы НАН Рэспублікі Беларусь, якую скончыла праз чатыры гады. З 1984-га – на выкладчыцкай працы ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава. Жывучы паэзіяй, Вольга Іванаўна і сваіх навучэнцаў «заразіла» гэтай справай. Вынікам такога «хобі» стала нараджэнне зборніка «Факультэт паэзіі», у які ўвайшлі і лепшыя ўзоры паэтычнай творчасці студэнцкай моладзі. А колькі маладых людзей выкладчыца выпесціла пад сваім крылом, даўшы надзейную пуцёўку ў дарослае жыццё! А колькі талентаў раскрыла сярод моладзі! Многія выпускнікі факультэта беларускай філалогіі і культуры працуюць зараз настаўнікамі ў розных кутках Беларусі, журналістамі ў газетах і часопісах, на радыё і тэлебачанні.

1987-м – час абароны кандыдацкай дысертацыі на тэму «Праблемы развіцця сучаснай беларускай лірыкі». Праз пяць год атрымала навуковую ступень дацэнта і ўзначаліла кафедру беларускай літаратуры ВДУ імя П. М. Машэрава.

Вольга Русілка – член Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтар звыш 90 навуковых, літаратурна-крытычных і метадычных публікацый па праблемах беларускай паэзіі і яе вывучэння ў школе, сярод якіх падручнікі «Родная літаратура. 7 клас», «Беларуская літаратура. 8 клас» (у суаўтарстве з М. Лазаруком і І. Слесаравай) і метадычны дапаможнік да яго. Артыкулы Вольгі Іванаўны друкуюцца ў рэспубліканскіх часопісах «Полымя», «Роднае слова», «Веснік БДУ. сер. 4, Філалогія», штотыднёвіку «ЛіМ» і іншых.

Галоўная тэма паэтычнай творчасці Вольгі Русілкі – Радзіма, яе некранутая прыгажосць, гісторыя, лёсы людзей. Вершы прасякнуты філасофскім роздумам пра сэнс чалавечага жыцця, сапраўдныя духоўныя каштоўнасці. Паэзія В. Русілкі вельмі лёгкая, празрыстая, хутка

26 красавіка – 60 гадоў таму (1954) нарадзілася Канявалава Наталля Юр'еўна, беларускі вучоны ў галіне біяхіміі, ураджэнка г. п. Відзы Браслаўскага раёна. Працуе ў ВДМУ.

27 красавіка – 60 гадоў таму (1954) нарадзілася Трафімовіч Тамара Рыгораўна, беларускі мовазнаўца, доктар філалагічных навук, ураджэнка в. Бельчыца Полацкага раёна.

28 красавіка – 80 гадоў таму (1934) нарадзіўся Бязлюдаў Артур Іосіфавіч (1934–1996), дзяржаўны дзеяч Беларусі, вучоны-эканаміст, ураджэнец г. Барані Аршанскага раёна.

28 красавіка – 30 гадоў таму (1984) загінуў у Афганістане ўраджэнец в. Залюбежжа Расонскага раёна Сяргей Генадзьевіч Каральневіч. Пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

29 красавіка – 85 гадоў таму (1929) нарадзілася Паўлава Марыя Пятроўна, вучоны ў галіне педыятрыі і гематалогіі, ураджэнка в. Падмішнеўе Шумілінскага раёна.

МАЙ

115 гадоў таму (1899) прайшла першая рабочая маёўка ў Віцебску.

1 мая – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Кандраценка Міхаіл Барысавіч (1924–2004), Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Трыніўкі Віцебскага раёна. Працаваў на торфапрадпрыемстве "Дабееўскі Мох" Шумілінскага раёна.

1 мая – 80 гадоў таму (1934) нарадзіўся Касалапаў Якаў Ягоравіч (1934–1982), беларускі кампазітар, выкладчык музычнага вучылішча і музычнай школы № 1 г. Віцебска (1966–1982 гг.), ураджэнец г. Оршы. Займаўся апрацоўкай музычнага фальклору Віцебшчыны.

1 мая – 75 гадоў таму (1939) ў Віцебску адкрыты помнік А. С. Пушкіну.

1 мая – 55 гадоў таму (1959) дала ток Клясціцкая ГЭС на рацэ Нішча Расонскага раёна. Яго атрымалі вёскі Кавалі, Маркова, Забалоцце, Сінск, Лапешчына, Казімірова, Пушча.

4 мая – 100 гадоў таму (1914) нарадзіўся Фрадкін Марк Рыгоравіч (1914–1990), кампазітар, ураджэнец г. Віцебска.

6 мая – 65 гадоў таму (1949) нарадзіўся Асінскі Ігар Мікалаевіч, журналіст, кандыдат гістарычных навук, ураджэнец в. Залессе Чашніцкага раёна.

7 мая – 55 гадоў таму (1959) нарадзіўся Ліпчык Міхаіл Яўстаф'евіч, беларускі баяніст, заслужаны артыст Беларусі, ураджэнец г. Глыбокае.

7 мая – 55 гадоў таму (1959) нарадзілася Урублеўская Святлана Паўлаўна, беларуская мастачка. З 1983 г. выкладае ў Віцебскім дзяржаўным тэхналагічным універсітэце.

8 мая – 80 гадоў таму (1934) нарадзіўся Ганчароў Мікалай Іванавіч (1934–1991), мастак, графік, мастацтвазнавец, пісьменнік, ураджэнец в. Заполле Віцебскага раёна.

РУСІЛКА

ВОЛЬГА ІВАНАЎНА

Да 55-годдзя з дня нараджэння (1959)

17 ліпеня 1959 года шчодрая на знакамітыя постаці зямля Прынямоння падаравала жыццё яшчэ аднаму таленавітаму чалавеку – самабытнай паэтцы Вользе Русілцы. А вёска Бершты Шчучынскага раёна з бруістай рачулкай Котрай была калыскай Вольгі з маленства. Паэтычны дар Вольга Іванаўна атрымала ў спадчыну ад сваёй маці Любові Мікалаеўны, філолага па адукацыі, якая шчыра захаплялася паэзіяй і навучыла дачку ўласныя думкі і пачуцці перадаваць пры дапамозе рыфмаванага радка. Першая спроба пяра адбылася яшчэ падчас вучобы ў школе, калі ў 1973 годзе шчучынская раённая газета «Савецкая вёска» змясціла на сваіх старонках вершы Вольгі «Кветкі» і «Восень». А ў 1975-м васьмікласніца Вольга Русілка даслала ў «Настаўніцкую газету» сваё эсэ «Лісток з магутнага дрэва», прысвечанае роднай мове.

Скончыўшы ў 1976 годзе сярэднюю школу, Вольга паступіла ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт на філалагічны факультэт, які закончыла ў 1981-м з чырвоным дыпломам. У насычаныя і цікавыя гады студэнцтва паэтка не здрадзіла сваёй любімай справе – служэнню паэзіі: была членам літаб'яднання «Узлёт», кіраўніком якога быў Алег Лойка, друкавалася ў

Рота обошла противника с фланга и внезапно атаковала его в районе железнодорожной станции, освободив ее от гитлеровцев.

Указом Президиума Верховного Совета СССР от 10 апреля 1945 года за образцовое выполнение боевых заданий командования на фронте борьбы с немецко-фашистскими захватчиками и проявленные при этом мужество и героизм старшему лейтенанту Константину Полозову присвоено звание Героя Советского Союза.

С 1950 г. – в запасе. Жил и работал в селе Медное Калининской (ныне Тверской) области, затем в деревне Буявино.

Награжден орденами Ленина, Красного Знамени, Отечественной войны 1-й степени, Красной Звезды.

Трагически погиб 10 сентября 1977 года. Похоронен на кладбище села Медное Тверской области.

ЛИТЕРАТУРА:

1. **Полазаў** Канстанцін Мікалаевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн, 2001. — Т. 12. — С. 450.

2. **Полазаў** Канстанцін Мікалаевіч // Памяць : Віцебск : гісторыка-дакументальныя хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі : у 2 кн. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.] ; склад. А. І. Мацяюн ; маст. Э. Э. Жакевіч. — Мн. : БелЭн, 2002. — Кн. 1. — С. 632—633.

3. **Полазаў** Канстанцін Мікалаевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1999. — Т. 5. — С. 518.

4. **Полозов** Константин Николаевич // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 2008. — Т. 6. — С. 156.

5. **Полозов** Константин Николаевич // Слава и гордость земли Витебской : биографический справочник / сост. М. Н. Пригожий ; редкол.: М. П. Кузьмич (пред.) [и др.]. — Витебск : Витеб. обл. тип., 2009. — С. 109.

9 мая – 110 гадоў таму (1904) нарадзіўся Дзеніскевіч Мікалай Міхайлавіч (1904–1937), дзяржаўны дзеяч Беларусі. З 1926 г. – інструктар Аршанскага абкома КПБ. З 1928 г. – сакратар Асвейскага райкома КПБ. З 1930 г. – інструктар Полацкага акруговага камітэта КПБ, загадчык аргаддзела Лепельскага райкома КПБ.

9 мая – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Груца Аляксей Пятровіч, беларускі мовазнавец, доктар філалагічных навук, прафесар, ураджэнец в. Пішчыкі Дубровенскага раёна.

9 мая – 65 гадоў таму (1949) нарадзіўся Рубанік Васілій Васільевіч, беларускі вучоны ў галіне тэхнічнай акустыкі, доктар тэхнічных навук, ураджэнец в. Бутава Ушацкага раёна. З 1976 г. працаваў у Віцебскім аддзяленні Інстытута фізікі цвёрдага цела і паўправаднікоў. З 1998 г. – загадчык кафедры Віцебскага тэхналагічнага ўніверсітэта.

11 мая – 30 гадоў таму (1984) нарадзілася Макарава Анастасія Аляксандраўна, беларуская спартсменка (шатакан каратэ-до), кандыдат у майстры спорту Беларусі, сярэбраны прызёр чэмпіяната свету, чэмпіёнка Еўропы, пераможца першынства свету, ураджэнка г. Наваполацка.

13 мая – 115 гадоў таму (1899) нарадзіўся Давыдаў Абрам Мордухавіч, вучоны ў галіне тэрапіі, загадчык кафедры Віцебскага медыцынскага інстытута, ураджэнец г. Себежа Віцебскай губерні.

13 мая – 60 гадоў таму (1954) нарадзіўся Сакалоўскі Міхаіл Ігнацьевіч, віцэ-адмірал, ураджэнец г. Віцебска.

14 мая – 200 гадоў таму (1814) нарадзіўся Касовіч Каятан Андрэевіч (1814–1883), вучоны ў галіне ўсходазнаўства, адзін з першых санскрытолагаў Расіі, ураджэнец г. Полацка.

14 мая – 175 гадоў таму (1839) нарадзіўся Каплінскі Васіль Тэлясфоравіч (1839 пасля 1883), удзельнік рэвалюцыйнага руху 1860-х гадоў, ураджэнец Докшыцкага раёна.

14 мая – 100 гадоў таму (1914) нарадзіўся Клопаў Анісім Андрэевіч (1914–1995), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, поўны кавалер ордэна Славы, ураджэнец в. Наваселле Ушацкага раёна.

16 мая – 75 гадоў таму (1939) нарадзіўся Кашыцкі Эдуард Сцяпанавіч, вучоны-медык, акадэмік Беларускай інжынернай акадэміі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнец Ушацкага раёна.

18 мая – 55 гадоў таму (1959) ў г. п. Шуміліна адкрыта музычная школа.

19 мая – 95 гадоў таму (1919) нарадзіўся Авекаў Іван Аўдзеевіч (1919–1943), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Асінаўка Дубровенскага раёна.

19 мая – 60 гадоў таму (1954) нарадзілася Апіёк Тамара Уладзіміраўна, беларускі вучоны-гісторык, ураджэнка в. Андрыянава Дубровенскага раёна.

[і інш.]. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1992. — Т. 1. — С. 426—444.

9. **Шапран, С. У.** Васіль Быкаў : гісторыя жыцця ў дакументах, публікацыях, успамінах, лістах : у 2 ч. / С. У. Шапран ; [навук. рэд. М. Тычына ; уступ. сл. Р. Барадуліна]. — Мінск — Гародня, 2009. — Ч. 1. — 734 с. — (Бібліятэка Бацькаўшчыны, Гарадзенская бібліятэка. Людзі Беларусі).

ПОЛОЗОВ КОНСТАНТИН НИКОЛАЕВИЧ

К 100-летию со дня рождения (1914)

Полозов Константин Николаевич родился 26 июня 1914 года в Витебске. Работал слесарем.

С 1936 г. – в Красной Армии. В 1939 г. Константин Полозов окончил курсы младших лейтенантов. Воевал на Центральном, Степном, 1-м Украинском фронтах в годы Великой Отечественной войны. Участник Львовско-Сандомирской, Берлинской и Пражской операций.

Командир роты мотострелкового батальона 69-й механизированной бригады (9-й механизированный корпус, 3-я гвардейская танковая армия, 1-й Украинский фронт) старший лейтенант Константин Полозов отличился 27 июля 1944 года в боях за город Самбор Львовской области (Украина).

ВАСІЛЮ БЫКАВУ

Ёсць людзі найвышэйшай пробы,
з металам грэшна іх раўняць –
яны ахвярныя асобы,
падчас так хочацца падняць
свой слабы дух да іх вышыняў,
да іх імкненняў, іх турбот…
Здаецца, нават сэрца б выняў,
каб іх пазбавіць ад грызот…

Уладзімір Папковіч

ЛІТАРАТУРА:

1. **Бугаёў, Д. Я.** Праўда і мужнасць таленту : выбранае : кніга пра Васіля Быкава, артыкулы, дыялог / Д. Я. Бугаёў ; прадм. І. Чыгрынава. — Мн. : Маст. літ., 1995. — 415 с.

2. **Быкаўскія** сітуацыі / падрыхт. Ж. Капуста // Літаратура і мастацтва. — 2009. — 19 чэрв. — С. 12.

3. **Быкова, В. В.** В деревне Волчо только одна Быкова — сестра писателя / В. В. Быкова ; беседовала В. Гнилозуб // Белорусская нива. — 2013. — 1 марта. — С. 15.

4. **Быкова, В. В.** Похоронку на Быкова прислали, когда родные уже точно знали: Василь — живой! / В. В. Быкова ; беседовала В. Гнилозуб // Белорусская нива. — 2013. — 2 марта. — С. 15.

5. **Локун, В. І.** Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры / В. І. Локун. — Мн. : Тэхнапрынт, 2005. — 227 с.

6. **Наш** Быкаў : кніга ўспамінаў / уклад. Г. Бураўкін. — Мн. : ГА БТ «Кніга», 2004. — 496 с.

7. **Рублевская, Л.** Пройдем на Виноградную / Л. Рублевская // Советская Белоруссия. — 2012. — 28 сент. — С. 9.

8. **Савік, Л. С.** Быкаў Васіль / Л. С. Савік, В. І. Козіч // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / рэдкал.: І. Э. Багдановіч

20 мая – 95 гадоў таму (1919) нарадзіўся Галецкі Пётр Антонавіч (1919–1942), удзельнік партызанскага руху на Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Майдан Талачынскага раёна.

21 мая – 75 гадоў таму (1939) нарадзілася Петрачкова Валянціна Цімафееўна, заслужаная артыстка Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі БССР, актрыса Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Я. Коласа.

22 мая – 60 гадоў таму (1954) нарадзіўся Снапкоўскі Уладзімір Еўдакімавіч, беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, ураджэнец г. Віцебска.

22 мая – 55 гадоў таму (1959) ў г. п. Лёзна адкрыта дзіцячая музычная школа.

22 мая – 50 гадоў таму (1964) нарадзіўся Пушкін Ігар Аляксандравіч, беларускі вучоны-гісторык, дацэнт, ураджэнец г. Оршы.

23 мая – 100 гадоў таму (1914) нарадзілася Круганава Ефрасіння Акімаўна (1914–1983), беларускі геабатанік, ураджэнка в. Старыя Вайханы Гарадоцкага раёна.

23 мая – 90 гадоў таму (1924) нарадзілася Наумава Соф'я Фадзееўна (1924–2000), беларускі вучоны ў галіне хіміі высокамалекулярных злучэнняў, доктар хімічных навук, ураджэнка в. Заазер'е Сенненскага раёна.

25 мая – 370 гадоў таму (1644) суддзя земскі браслаўскі Севасціян Святаполк Мірскі заснаваў праваслаўны манастыр у Міёрах.

25 мая – 120 гадоў таму (1894) нарадзіўся Пацалуеўскі Аляксандр Пятровіч (1894–1948), мовазнавец, вучоны-цюрколаг, ураджэнец Віцебскай губерні.

26 мая – 75 гадоў таму (1939) нарадзіўся Караткоў Аркадзь Цімафеевіч, архітэктар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, ураджэнец г. Полацка.

27 мая – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Бохан Дзмітрый Мікітавіч (1924–1944), удзельнік Аршанскага антыфашысцкага падполля, ураджэнец в. Падгайшчына Аршанскага раёна.

27 мая – 60 гадоў таму (1954) нарадзілася Цытрон Галіна Станіславаўна, беларускі вучоны ў галіне глебазнаўства, ураджэнка в. Калінаўка Дубровенскага раёна.

27 мая – 55 гадоў таму (1959) нарадзіўся Косінец Аляксандр Мікалаевіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі, старшыня Віцебскага аблвыканкама, беларускі вучоны ў галіне хірургіі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, ураджэнец в. Роскі Сялец Аршанскага раёна.

28 мая – 120 гадоў таму (1894) нарадзіўся Перхаровіч Франц Іосіфавіч (1894–1961), генерал-лейтэнант, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Заляддзе Докшыцкага раёна.

29 мая – 115 гадоў таму (1899) была заснавана Віцебская льнопрадзільная фабрыка "Дзвіна". Адкрыта 01.09.1900 г. Зараз – ААТ "Віцебскія дываны".

Ганаровы грамадзянін г. п. Ушачы (1984). Узнагароджаны двума ордэнамі Леніна, ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, Айчыннай вайны 1-й ступені, Чырвонай Зоркі.

Памёр 22 чэрвеня 2003 года і пахаваны на Усходніх могілках у Мінску.

Але і пасля смерці Васіля Быкава з’яўляюцца на старонках друку невядомыя беларускаму чытачу творы. У кнігу «Бліндаж» (2007) увайшлі аповесці «Бліндаж» (1987) і «Апошні баец» (1958), якія раней не ўключаліся аўтарам у ніводзін свой зборнік.

Удава пісьменніка І. М. Быкава перадала дачу ў пасёлку Ждановічы-6 Мінскага раёна ва ўласнасць дзяржавы для стварэння Дзяржаўнага музея Васіля Быкава.

Мікалай Чаргінец: «Для сучаснага беларуса Васіль Быкаў павінен стаць найперш прыкладам сапраўднага чалавека. Ён заўсёды быў сумленным, сціплым, адкрытым. Можа быць гэта прымушала яго часам вельмі моцна пакутаваць. Яго поглядаў можна не падзяляць, з ім можна не згаджацца, але ў любым выпадку нельга недаацэньваць».

ВАСІЛЮ БЫКАВУ

Час стагоддзі, як касой, сцінае,
Веры, царствы, догмы йдуць да ценяў…
Усё мінае – Гонар не мінае,
Бо народжаны адным сумленнем.
Калі сонца выб’ецца з туману,
Толькі іх успомніць хор народаў,
Воінаў сваіх, святых і зраненых,
Рыцараў сумлення і свабоды.

Уладзімір Караткевіч

музыка Я. Глебава), па аповесці «Воўчая зграя» – оперу «Сцежкаю жыцця» (1980, музыка Г. Вагнера).

Аповесць «Пакахай мяне, салдацік» (1996) тэматычна звязана з цыклам «ваенных» апавяданняў. Аповесць «Ваўчыная яма» (1999) расказвае пра жыццё ў чарнобыльскай зоне. Надзвычай складаныя рэаліі ваеннай рэчаіснасці паўстаюць з аповесці «Балота» (2001).

Яшчэ адна іпастась пісьменніка – сучасны Быкаў, аўтар «баек жыцця» з філасофска-алегарычным зместам: «Сцяна» (1995), «Музыка», «Народныя мсціўцы» (1997), «Мальбара», «Тры нявымаўленых словы», «Труба» (1998), «Галоўны крыгсман», «Хутаранцы», «Апалагетыка “нагана”», «Кошка і мышка» (1999). Выходзяць кнігі прозы «Сцяна» (1997), «Пахаджане» (1999). Быкаўскія прыпавесці ўвайшлі ў супольную кнігу Рыгора Барадуліна і Васіля Быкава «Калі рукаюцца душы» (2003). Працягвае тэму сяброўства кніга «Дажыць да зялёнай травы» (2008). Кнігу пад такой назвай Васіль Быкаў і Рыгор Барадулін пісалі 43 гады. Складаецца яна з сяброўскага ліставання двух выдатных творцаў, якое пачалося ў 1960 годзе і закончылася ў 2003 годзе.

У гады перабудовы Васіль Уладзіміравіч актывізаваўся як грамадскі дзеяч, публіцыст. Яго выступленні, артыкулы, інтэрв’ю склалі зборнікі «На крыжах» (1992) і «Крыжовы шлях» (1998). Пісьменнік падсумаваў вынікі свайго жыцця і творчасці кнігай успамінаў «Доўгая дарога дадому» (2002).

Адной з апошніх прац В. Быкава сталі аповеды Барыса Кіта «Цярновы шлях», запісаныя Васілём Быкавым улетку 2001 г. у Франкфурце-на-Майне, якія пазней увайшлі ў кнігу «Грамадзянін свету» (2004). Кожны з 12 аповедаў пачынаецца лірычна-белетрыстычным уступам самога Васіля Быкава, які пры гэтым каларытна характарызуе нямецкія рэаліі і апавядальніка.

Творы Быкава перакладзены на розныя мовы.

В. Дашук на кінастудыі «Беларусьфільм» стварыў пра Васіля Быкава фільм «Узыходжанне» (1985).

29 мая – 75 гадоў таму (1939) нарадзілася Максімава Ларыса Паўлаўна, піяністка, заслужаная артыстка Беларусі, ураджэнка г. Віцебска.

29 мая – 75 гадоў таму (1939) нарадзілася Пісарава Людміла Іванаўна, актрыса тэатра імя Я. Коласа, заслужаная артыстка Беларусі, ураджэнка г. п. Руба Віцебскага раёна.

30 мая – 105 гадоў таму (1909) нарадзіўся Гаранскі Георгій Кірылавіч (1909–2002), галоўны архітэктар г. Оршы, аўтар Кургана Бессмяротнасці, адзін з аўтараў помніка "Кацюша", ураджэнец г. Оршы.

ЧЭРВЕНЬ

95 гадоў таму (1919) адбылася Першая справаздачная выстава Віцебскага мастацкага вучылішча.

70 гадоў таму (1944) была здзейснена Віцебска-Аршанская аперацыя 1944 г. – наступальная аперацыя войскаў 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў у Вялікую Айчынную вайну, састаўная частка Беларускай аперацыі 1944 г.

25 гадоў таму (1989) адбыўся першы конкурс "Віцебская прыгажуня", у якім перамагла будучая Міс СССР-1990 Марыя Кежа.

2 чэрвеня – 75 гадоў таму (1939) адкрылася карцінная галерэя Ю. М. Пэна. Дзейнічала да ліпеня 1941 г.

3 чэрвеня – 65 гадоў таму (1949) нарадзілася Богдан Ніна Іванаўна, беларускі вучоны-эканаміст. З 1979 г. працуе ў Полацкім дзяржаўным універсітэце.

5 чэрвеня – 160 гадоў таму (1854) нарадзіўся Пэн Юдаль (Іегуда) Майсеевіч (1854–1937), жывапісец, педагог, заснавальнік Віцебскай школы-майстэрні. З 1891 г. жыў і працаваў у г. Віцебску.

5 чэрвеня – 70 гадоў таму (1944) нарадзіўся Анісенка Валерый Данілавіч, беларускі акцёр, рэжысёр, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі, ураджэнец г. Талачына. У 1965–1977 гг. – акцёр беларускіх тэатраў імя Я. Коласа і Я. Купалы.

6 чэрвеня – 115 гадоў таму (1899) ў Оршы заснавана публічная бібліятэка імя А. С. Пушкіна. Зараз – Аршанская цэнтральная гарадская бібліятэка імя А. С. Пушкіна.

7 чэрвеня – 95 гадоў таму (1919) створаны губернскі прафсаюз пажарных.

7 чэрвеня – 75 гадоў таму (1939) нарадзіўся Скарынкін Уладзімір Максімавіч, паэт, перакладчык, лаўрэат Нацыянальнай прэміі Італіі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы, ураджэнец г. Віцебска.

8 чэрвеня – 20 гадоў таму (1994) Фабрыка мастацкіх вырабаў у г. Верхнядзвінску была пераўтворана ў АТ "МІЛА".

11 чэрвеня – 95 гадоў таму (1919) ў Віцебску знаходзіўся з агітпоездам "Кастрычніцкая рэвалюцыя" старшыня УЦВК Міхаіл Іванавіч Калінін.

12 чэрвеня – 50 гадоў таму (1964) нарадзіўся Багніч Сяргей Анатольевіч, беларускі вучоны ў галіне спектраскапіі арганічных злучэнняў, ураджэнец г. Гарадка.

філасофска-канцэптуальнага і жанравага падпарадкавання асабіста перажытага духоўным патрэбам сучаснасці.

У канцы 1960-х гадоў звярнуўся да тэмы партызанскай і падпольнай барацьбы беларускага народа. «Круглянскі мост» (1969), «Сотнікаў» (1970), «Абеліск» (1971), «Воўчая зграя» (1974), «Пайсці і не вярнуцца» (1978), «Знак бяды» (1982) у творчасці пісьменніка складаюць своеасаблівы «партызанскі» цыкл. Элемент трагічнага – істотны элемент вайны выявіўся тут на ўсю моц. Твор «Абеліск» разам з аповесцю «Дажыць да світання» (1973) адзначаны Дзяржаўнай прэміяй СССР 1974 года; «Воўчая зграя» разам з аповесцю з франтавога жыцця «Яго батальён» (1975) адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Я. Коласа 1978 года. Аповесць «Знак бяды» ўдастоена Ленінскай прэміі ў 1986 годзе.

У аповесцях «Знак бяды», «Аблава» (1989) Васіль Быкаў узняў трагічную тэму сталіншчыны, раскулачвання, знішчэння гаспадара зямлі. Раман «Кар'ер» (1986), аповесці «У тумане» (1987), «Сцюжа» (1993), апавяданні «На Чорных лядах», «Перад канцом», «Бедныя людзі» і іншыя пазначаны актыўнай аўтарскай пазіцыяй, мастацкім асваеннем новых гістарычных пластоў жыцця, вострым эмацыянальна-этычным напалам, высокім трагізмам.

Кнігі Быкава, поўныя высокага грамадзянскага пафасу, веры ў вялікія духоўныя магчымасці, нянавісці да подласці, хлусні, здрадніцтва, актыўна служаць выхаванню чалавека. Васіль Быкаў – аўтар п'ес «Рашэнне» (1972) і «Апошні шанц» (пастаўлена ў 1974 г.), гумарыстычных і сатырычных апавяданняў (зборнік «Ход канём», 1960).

Па яго сцэнарыях пастаўлены кінафільмы «Трэцяя ракета» (1963), «Альпійская балада» (1966), «Дажыць да світання» (1975), «Воўчая зграя» (1976), «Абеліск» (1976), трохсерыйны тэлефільм «Доўгія вёрсты вайны» (1976). Па матывах аповесці «Пайсці і не вярнуцца» створаны спектакль (1979), па аповесці «Сотнікаў» – кінафільм «Узыходжанне» (1977), па аповесці «Знак бяды» – кінафільм (1985). Беларускі тэатр оперы і балета па матывах «Альпійскай балады» (1964) паставіў аднайменны балет (1967,

жывых толькі чацвёра). З 1943 г. ваяваў на 2-м і 3-м Украінскіх франтах. Быў двойчы паранены, ляжаў у шпіталях. У 1944 г. бацькі Васіля Быкава атрымалі паведамленне, што іх сын мужна загінуў у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі каля Кіраваграда (гэта было засведчана на абеліску). Але Васіль Уладзіміравіч выжыў і ваяваў далей. З дзеючай арміяй прайшоў Румынію, Балгарыю, Венгрыю, Югаславію, Аўстрыю – старшым лейтэнантам, камандзірам узвода палкавой, потым армейскай артылерыі. Служыў на Украіне, у Беларусі, на Далёкім Усходзе.

У 1947 г. Васіль Быкаў пасля дэмабілізацыі жыў у г. Гродна. Працаваў мастаком у гродзенскіх майстэрнях, у 1947–1949 гг. – у рэдакцыі абласной газеты «Гродзенская праўда». У 1949–1955 гг. зноў служыў у Савецкай Арміі. У 1956–1972 гг. канчаткова дэмабілізаваўся (маёр запаса), працаваў літаратурным супрацоўнікам, літаратурным кансультантам газеты «Гродзенская праўда». Выступаў як журналіст. У абласным і рэспубліканскім друку пачалі з'яўляцца яго замалёўкі, фельетоны, нарысы.

У 1972–1978 гг. – сакратар Гродзенскага аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. З 1978 г. жыў у Мінску. У 1990–1993 гг. з’яўляўся прэзідэнтам згуртавання беларусаў свету «Бацькаўшчына».

З 1947 г. Васіль Уладзіміравіч Быкаў пачаў друкавацца. У першай кнізе «Жураўліны крык» (1960), аповесцях «Здрада» (1961), «Трэцяя ракета» (1962, Літаратурная прэмія імя Я. Коласа ў 1964 г.), зборніку апавяданняў «Адна ноч» (1965) паказвае штодзённы гераізм звычайнага чалавека ва ўмовах вайны, глыбока пранікае ў духоўны свет сваіх герояў. Суровая праўда ў адлюстраванні вайны, пераважна драматычных і трагічных яе сітуацый, пільная ўвага да думак і пачуццяў чалавека, абвостраная чалавечнасць, высокая патрабавальнасць у сцвярджэнні маральных прынцыпаў, лаканізм, дакладнасць і выразнасць апавядальнай манеры, шчырасць і ўнутраная стрыманасць аўтарскага голасу – вызначальныя якасці творчай манеры пісьменніка. Аповесці «Мёртвым не баліць» (1965) і «Праклятая вышыня» (1968) – важны крок на шляху

13 чэрвеня – 180 гадоў таму (1834) нарадзіўся Вераніцын Канстанцін Васільевіч (сапр. Васільеў 1834–1904), літаратар, магчымы аўтар паэмы "Тарас на Парнасе", ураджэнец в. Астраўляны Гарадоцкага раёна.

13 чэрвеня – 105 гадоў таму (1909) створана Віцебская вучоная архіўная камісія – паўафіцыйнае гістарычнае таварыства Віцебскай губерні. Ліквідавана ў 1919 г.

14 чэрвеня – 105 гадоў таму (1909) нарадзіўся Кавалёў Іван Аляксандравіч (1909–1998), беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, прафесар, ураджэнец в. Аралава Полацкага раёна.

15 чэрвеня – 110 гадоў таму (1904) нарадзіўся Басулаеў Анатоль Фядотавіч (1904–1964), расійскі мастак тэатра, галоўны мастак Беларускага другога дзяржаўнага тэатра (1934–1938 гг.).

19 чэрвеня – 95 гадоў таму (1919) ў Віцебску прайшоў першы на Беларусі камуністычны суботнік.

19 чэрвеня – 90 гадоў таму (1924) нарадзіўся Быкаў Васіль Уладзіміравіч (1924–2003), беларускі пісьменнік, празаік, драматург, публіцыст, грамадскі дзеяч, народны пісьменнік Беларусі, Герой Сацыялістычнай Працы, ураджэнец в. Бычкі Ушацкага раёна.

19 чэрвеня – 60 гадоў таму (1954) нарадзіўся Гяноў Уладзімір Мікалаевіч, беларускі спартсмен і трэнер (вадналыжны спорт), майстар спорту СССР, суддзя ўсесаюзнай катэгорыі, заслужаны трэнер Беларусі. З 1976 г. – трэнер-выкладчык Наваполацкай спецыялізаванай дзіцяча-юнацкай школы алімпійскага рэзерву па вадналыжным спорце імя М. Л. Гянова.

20 чэрвеня – 115 гадоў таму (1899) нарадзіўся Сяргейчык Цімафей Мікалаевіч (1899–1977), акцёр, народны артыст Беларусі. У 1926–1975 гг. працаваў у тэатры імя Я. Коласа.

20 чэрвеня – 105 гадоў таму (1909) нарадзіўся Кандрацьеў Пётр Васільевіч (1909–1943), удзельнік савецка–фінляндскай вайны і Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Віцебска.

21 чэрвеня – 150 гадоў таму (1864) нарадзіўся Глебаў Іван Аляксандравіч, беларускі гісторык, педагог, ураджэнец г. Віцебска.

22 чэрвеня – 100 гадоў таму (1914) нарадзіўся Полазаў Канстанцін Мікалаевіч (1914–1977), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец г. Віцебска.

23 чэрвеня – 95 гадоў таму (1919) арганізаваны Віцебскі губернскі аддзел Усерасійскага прафсаюза работнікаў мастацтва.

23 чэрвеня – 65 гадоў таму (1949) нарадзілася Алпеева Тамара Міхайлаўна, беларускі філосаф, культуролаг, ураджэнка г. Лепеля.

23 чэрвеня – 30 гадоў таму (1984) адкрыты музей працоўнай і баявой славы пасёлка Асінторф Дубровенскага раёна.

24 чэрвеня – 80 гадоў таму (1934) нарадзілася Яфімцава Алена Пятроўна (1934–1977), беларускі вучоны ў галіне біяхіміі. З 1968 г. працавала загадчыкам кафедры ў Віцебскім медыцынскім інстытуце.



БЫКАЎ

ВАСІЛЬ УЛАДЗІМІРАВІЧ

Да 90-годдзя з дня нараджэння

Быкаў Васіль Уладзіміравіч нарадзіўся 19 чэрвеня 1924 года ў вёсцы Бычкі Ушацкага раёна. Беларускі пісьменнік, грамадскі дзеяч. Народны пісьменнік Беларусі (1980). Герой Сацыялістычнай працы (1984).

Васіль Быкаў паходзіць з сялянскай сям'і. Бацькі, Уладзімір Фёдаравіч і Ганна Рыгораўна, увесь час жылі ў вёсцы, працавалі ў калгасе. Бацька ўдзельнічаў у 1-й сусветнай вайне, з арміяй Самсонава трапіў у палон. Пасля вызвалення з палону ўдзельнічаў у грамадзянскай вайне. У 1939 г. Васіль Быкаў скончыў 8 класаў Кубліцкай сярэдняй школы і паступіў на скульптурнае аддзяленне Віцебскага мастацкага вучылішча. Аднак восенню 1940 года, у сувязі з пагаршэннем матэрыяльнага становішча сям'і і адменай дзяржаўных стыпендый, вымушаны быў пакінуць вучобу ў вучылішчы. Паступіў у Віцебскую школу ФЗН № 5, дзе вучыўся да мая 1941 года. У чэрвені 1941 г. экстэрнам здаў экзамены за дзясяты клас Кубліцкай школы.

У самым пачатку Вялікай Айчыннай вайны быў мабілізаваны на абарончыя работы. У якасці байца інжынернага батальёна будаваў розныя ваенныя аб'екты ад Гомеля да Варонежа. Зімой 1941–1942 гг. жыў на станцыі Салтыкоўка і ў г. Аткарску Саратаўскай вобласці, дзе вучыўся ў чыгуначнай школе.

Улетку 1942 г. быў прызваны ў Чырвоную Армію. Скончыў Саратаўскае пяхотнае вучылішча (з 80 выпускнікоў у вайну засталіся ў

ЛІТАРАТУРА:

1. **Гарэлік, Л. М.** Скарынкін Уладзімір / Л. М. Гарэлік, В. У. Смольская // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік : у 6 т. / пад рэд. А. В. Мальдзіса. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1995. — Т. 5. — С. 358—361.

2. **Мішчанчук, М. І.** Скарынкін Уладзімір Максімавіч / М. І. Мішчанчук // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1987. — Т. 5. — С. 19.

3. **Саламевіч, І. У.** Скарынкін Уладзімір Максімавіч / І. У. Саламевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн, 2002. — Т. 14. — С. 449.

4. **Саматой, І.** Уладзімір Скарынкін / І. Саматой // Літаратурныя постаці Віцебшчыны: гісторыя і сучаснасць : зборнік навуковых артыкулаў / рэдкал.: В. І. Русілка [і інш.]. — Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2008. — С. 99—105.

5. **Свірко, І.** «З былых стагоддзяў да мяне дайшло Пятраркі, Дантэ, Байрана святло» / І. Свірко // Рэспубліка. — 2011. — 14 мая. — С. 16.

25 чэрвеня – 70 гадоў таму (1944) пры вызваленні Віцебшчыны здзейсніў подзвіг Юрый Васільевіч Смірноў (1925–1944), Герой Савецкага Саюза.

26 чэрвеня – 165 гадоў таму (1849) нарадзіўся Плюшчэўскі-Плюшчык Уладзімір Аляксеевіч (1849–1926), беларускі энтамолаг. Жыў і працаваў у г. Віцебску.

26 чэрвеня – 70 гадоў таму (1944) Віцебск вызвалены ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў.

26 чэрвеня – 70 гадоў таму (1944) Дубровеншчына вызвалена ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў.

26 чэрвеня – 40 гадоў таму (1974) ў Віцебску адкрыты помнік воінам Савецкай Арміі, партызанам і падпольшчыкам Беларусі.

27 чэрвеня – 105 гадоў таму (1909) нарадзіўся Знаёмы Сяргей (сапр. Клопаў Сяргей Змітравіч 1909–1937?), беларускі пісьменнік, ураджэнец в. Звонь Ушацкага раёна.

27 чэрвеня – 100 гадоў таму (1914) нарадзіўся Эльперын Ісаак Тавелевіч, вучоны ў галіне цепламасаабмену, ураджэнец г. Дзвінска Віцебскай губерні.

27 чэрвеня – 70 гадоў таму (1944) Орша вызвалена ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў.

27 чэрвеня – 65 гадоў таму (1949) нарадзіўся Хвастоў Міхаіл Міхайлавіч, дзяржаўны дзеяч Беларусі, дыпламат, ураджэнец в. Казлоўшчына Пастаўскага раёна.

28 чэрвеня – 130 гадоў таму (1884) нарадзілася Нікановіч-Сахарава Вольга Фёдараўна (1884–1943), беларуская пісьменніца, педагог, фалькларыст, ураджэнка в. Казаноўка Чашніцкага раёна.

28 чэрвеня – 70 гадоў таму (1944) Лепельскі раён вызвалены ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

29 чэрвеня – 100 гадоў таму (1914) нарадзіўся Левін Барыс Міхайлавіч (1914–1990), беларускі акцёр, заслужаны артыст Беларусі, ураджэнец г. Віцебска. У 1938–1983 гг. працаваў у Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

29 чэрвеня – 80 гадоў таму (1934) нарадзіўся Градаў Юрый Міхайлавіч, заслужаны архітэктар Беларусі, аўтар мемарыяльных комплексаў "Кацюша" ў Оршы, "Прарыў" ва Ушацкім раёне, "Праклён фашызму" ў Докшыцкім раёне.

29 чэрвеня – 70 гадоў таму (1944) Ушацкі раён быў вызвалены ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў.

ЛІПЕНЬ

90 гадоў таму (1924) створана Аршанскае акруговае краязнаўчае таварыства.

85 гадоў таму (1929) была арганізавана сельскагаспадарчая арцель "Гігант" імя Варашылава ў Гарадоцкім раёне.

70 гадоў таму (1944) ў г. Докшыцы была заснавана хата–чытальня. З 1977 г. – Докшыцкая цэнтральная раённая бібліятэка.

70 гадоў таму (1944) за прарыў Віцебскага ўмацаванага раёна і вызваленне г. Віцебска ў ходзе Віцебска-Аршанскай аперацыі ў Вялікую Айчынную вайну злучэнні і часткі 39-й, 43-й, 1-й паветранай армій 3-га Беларускага і 1-га Прыбалтыйскага франтоў атрымалі найменне "Віцебскія злучэнні і часткі".

праблемамі сучаснасці, пытанні духоўнасці. Піша для дзяцей: кнігі вершаў, скорагаворак і казак «Канікулярная ангіна» (1991), «Падарожжа ў Крайшарад» (1997); фантастычна-прыгодніцкія апавяданні «У карэце па белым свеце» (2000).

На беларускую мову пераклаў зборнікі вершаў М. Рубцова «Рускі агеньчык» (1986), М. Вінграноўскага «Украінскі прэлюд» (1999), паэму Дантэ Аліг'еры «Боская камедыя» (1997). За пераклад апошняй паэмы Уладзімір Максімавіч стаў лаўрэатам Нацыянальнай прэміі Італіі (1998), Дзяржаўнай прэміі Беларусі імя Я. Купалы (2000). У 2001 г. у серыі «Скарбы сусветнай літаратуры» былі выдадзены паэмы Джорджа Байрана «Прароцтва Дантэ» і «Дон Жуан» у перакладзе на беларускую мову Уладзіміра Скарынкіна. Адначасова з апошнімі перакладамі былі напісаны «Песня перакладчыка» і «Заключная песня перакладчыка», невялікае празаічнае эсэ «Мой Байран», якія з'яўляюцца аўтарскім апавядальным словам, зваротам да чытачоў спасцігаць прыгажосць і мудрасць еўрапейскай культуры.

Наступным этапам у літаратурнай дзейнасці Уладзіміра Максімавіча стаў пераклад сямнаццаці лепшых санетаў Франчэска Пятраркі на беларускую мову. Менавіта пад уплывам гэтай працы аўтар стварыў і свой уласны вянок санетаў «Вачэй тваіх паляны», прысвечаны жонцы.

У 2012 г. творы Дантэ Аліг'еры «Кніга песняў» і Франчэска Пятраркі «Новае жыццё», перакладзеныя на беларускую мову Уладзімірам Максімавічам Скарынкіным, былі адзначаны знакам-сімвалам «Залаты купідон» у намінацыі «Мастацкі пераклад» Рэспубліканскага конкурсу «Лепшы літаратурны твор года». У апошнія гады перакладчыцкая дзейнасць складае аснову працы Уладзіміра Скарынкіна. Перакладаючы шэдэўры сусветнай літаратуры, Уладзімір Максімавіч паважліва адносіцца да аўтараў, дасягае сэнсава-мастацкай адпаведнасці перакладу арыгінала і даносіць да чытача духоўны вопыт стагоддзяў, неабмежаваны магчымасці роднага слова.

Жыве і займаецца творчай дзейнасцю ў Мінску.

ЧЭРВЕНЬ



СКАРЫНКІН

УЛАДЗІМІР МАКСІМАВІЧ

Да 75-годдзя з дня нараджэння (1939)

Скарынкін Уладзімір Максімавіч нарадзіўся 7 чэрвеня 1939 года ў Віцебску ў сям'і служачых. Беларускі паэт, перакладчык, публіцыст.

У 1945 г. загінуў яго бацька пры штурме войскамі 1-га Беларускага фронту Зеелаўскіх вышынь каля Берліна. У 1943–1945 гг. Уладзімір Скарынкін разам з маці быў вывезены ў працоўны лагер г. Лібава, затым у г. Бранберг (Германія). У 1946–1956 гг. вучыўся ў СШ № 2 г. Гарадка. Школу скончыў з залатым медалём.

Скончыў Рыжскае ваеннае авіяцыйнае вучылішча, Рыжскі інстытут інжынераў грамадзянскай авіяцыі (1961). З 1961 г. працаваў у Мінскім аэрапорце. З 1970 г. – у Беларускім упраўленні грамадзянскай авіяцыі. У 1982–1987 гг., 1992–1997 гг. – у Саюзе беларускіх пісьменнікаў.

Друкуецца з 1955 года. Першы зборнік вершаў «Буслы над аэрадромам» (1969). Аўтар вянка санетаў «Вачэй тваіх паляны» (1980), паэм «Дарога ў неба» (1970), «Насустрач веку» (1971), «Сляпы дождж» (1974), «Высокае сонца» (1976), «Узнясенне» (1983), «Астральны знак Скарыны» (1987). Асноўныя тэмы яго твораў – маленства, апаленае вайной, любоў да роднай зямлі, яе гісторыі, роздум над складанымі

1 ліпеня – 70 гадоў таму (1944) Бягомльскі і Докшыцкі раёны вызвалены ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў у ходзе Мінскай і Полацкай аперацый 3-га Беларускага і 1-га Прыбалтыйскага франтоў ва ўзаемадзеянні з партызанамі брагады "Жалязняк".

1 ліпеня – 70 гадоў таму (1944) Шаркаўшчына была вызвалена ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў.

1 ліпеня – 65 гадоў таму (1949) нарадзілася Цяпкова Таццяна Канстанцінаўна, беларуская фалькларыстка, ураджэнка в. Малое Кашо Гарадоцкага раёна.

2 ліпеня – 95 гадоў таму (1919) нарадзіўся Серыкаў Іван Арцёмавіч (1919–1997), танцоўшчык, балетмайстар, педагог, рэжысёр, збіральнік харэаграфічнай спадчыны беларусаў. З 1962 г. – мастацкі кіраўнік і балетмайстар Віцебскага народнага ансамбля песні і танца "Маладосць" Палаца культуры ўпраўлення бытавога абслугоўвання насельніцтва.

3 ліпеня – 70 гадоў таму (1944) нарадзіўся Швальбо Уладзімір Ільіч, беларускі спартыўны педагог, заслужаны трэнер СССР і Беларусі, майстар спорту СССР, ураджэнец г. Віцебска.

3 ліпеня – 70 гадоў таму (1944) Браслаўскі раён вызвалены ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў.

3 ліпеня – 70 гадоў таму (1944) Беларусь вызвалена ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў.

3 ліпеня – 25 гадоў таму (1989) быў адкрыты санаторый–прафілакторый "Лясное" ў в. Дамашкавічы Докшыцкага раёна.

4 ліпеня – 70 гадоў таму (1944) Міёры вызвалены ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў.

4 ліпеня – 70 гадоў таму (1944) Полацк вызвалены ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў.

4 ліпеня – 20 гадоў таму (1994) адкрыты Міёрскі гісторыка–этнаграфічны музей.

5 ліпеня – 70 гадоў таму (1944) Паставы вызвалены ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў.

5 ліпеня – 45 гадоў таму (1969) быў адкрыты Віцебскі абласны музей Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова.

6 ліпеня – 105 гадоў таму (1909) нарадзіўся Вярхоўскі Сяргей Барысавіч (1909–1963), ваенны марак, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, контр–адмірал, ураджэнец в. Ільіно Віцебскага раёна.

6 ліпеня – 70 гадоў таму (1944) часцямі 29–й стралковай дывізіі ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў вызвалены г. п. Друя Браслаўскага раёна.

6 ліпеня – 55 гадоў таму (1959) нарадзіўся Казак Іван Уладзіміравіч, беларускі мастак, скульптар, ураджэнец г. п. Бешанковічы.

7 ліпеня – 65 гадоў таму (1949) нарадзіўся Вашук Уладзімір Васільевіч, беларускі хімік, ураджэнец в. Весялова Лепельскага раёна.

8 ліпеня – 170 гадоў таму (1844) нарадзіўся Кірпічоў Канстанцін Львовіч (1844–1910), інжынер–генерал, прафесар. Паходзіў з полацкага дваранства.

8 ліпеня – 70 гадоў таму (1944) ад нямецка–фашысцкіх захопнікаў вызвалены г. Браслаў.

8 ліпеня – 65 гадоў таму (1949) ў Віцебску адкрыўся гарадскі парк культуры і адпачынку імя Фрунзе.

«Инфекция в хирургии», подготовлены 3 доктора и 8 кандидатов медицинских наук. Автор более 350 печатных изданий, в том числе 10 монографий и 5 учебных пособий. Им проведена большая организационно-методическая и общественная работа. С 1995 г. – председатель Республиканской аттестационной комиссии по присвоению квалификационной категории врачам-хирургам, учредитель и главный редактор первого белорусского научно-практического журнала «Новости хирургии», председатель Витебского областного отделения фонда «Единение».

В декабре 2005 г. Александр Николаевич Косинец назначен заместителем премьер-министра Республики Беларусь. Занимая эту должность, он внес значительный вклад в разработку и организацию осуществления Национальной программы демографической безопасности.

С ноября 2008 г. – председатель Витебского облисполкома.

Доктор медицинских наук (1994), профессор (1995), член-корреспондент Белорусской академии медицинских наук (1996), Почетный член Польской академии медицины (1997), член Совета Республики Национального собрания Республики Беларусь (2004), заслуженный деятель науки Республики Беларусь (2004).

Награжден медалью «За трудовую доблесть» (1981), золотой медалью Альберта Швейцера (1998), знаком «Отличник здравоохранения Республики Беларусь» (2000), медалью «60 лет освобождения Республики Беларусь от немецко-фашистских захватчиков» (2004).

ЛИТЕРАТУРА:

1. **Александр** Косинец назначен председателем Витебского облисполкома // Народная газета. — 2008. — 25 лістап. — С. 1.

2. **Александр** Косинец — член Совета Республики // Віцебскі рабочы. — 2009. — 10 янв. — С. 1.

3. **Косинец** Александр Николаевич // Республика Беларусь : энциклопедия : в 6 т. / редкол.: Г. П. Пашков (гл. ред.) [и др.]. — Мн. : БелЭн, 2007. — Т. 4. — С. 235.

КОСИНЕЦ
АЛЕКСАНДР НИКОЛАЕВИЧ
К 55-летию со дня рождения (1959)

Косинец Александр Николаевич родился 27 мая 1959 года в д. Росский-Селец Оршанского района. Белорусский ученый в области хирургии, государственный деятель.

В 1976 г. с золотой медалью окончил СШ № 17 г. Орши. В 1982 г. с отличием окончил лечебно-профилактический факультет Витебского государственного медицинского института. В годы учебы возглавлял штаб трудовых дел, комсомольскую организацию института. В 1982–1984 гг. – клиническая ординатура на кафедре госпитальной хирургии. В 1984–1987 гг. – аспирант кафедры хирургических болезней № 1 Витебского медицинского института. В 1987–1991 гг. – ассистент, в 1991–1994 гг. – доцент, в 1995–1997 гг. – профессор кафедры госпитальной хирургии.

В 1988 г. А. Н. Косинец защитил кандидатскую, в 1994 г. – докторскую диссертацию.

С 1995 г. Александр Николаевич Косинец – руководитель республиканского научно-практического центра «Инфекция в хирургии», в 1997–2005 гг. – ректор Витебского государственного медицинского университета, профессор кафедры хирургии факультета повышения квалификации специалистов.

Александр Николаевич Косинец создал научно-педагогическую школу и новое научное направление в Республике Беларусь по проблеме

9 ліпеня – 130 гадоў таму (1884) нарадзіўся Барадзін Міхаіл Маркавіч (сапр. Грузенберг 1884–1951), рэвалюцыянер, савецкі дзяржаўны і палітычны дзеяч, ураджэнец г. п. Янавічы Віцебскага раёна.

10 ліпеня – 100 гадоў таму (1914) нарадзіўся Порахаў Фёдар Фёдаравіч (1914–1998), беларускі вучоны ў галіне ветэрынарыі, загадчык кафедры Віцебскага ветэрынарнага інстытута (1964–1993 гг.).

12 ліпеня – 60 гадоў таму (1954) нарадзіўся Кірылін Пётр Аляксеевіч, беларускі мастак, ураджэнец г. Віцебска.

14 ліпеня – 85 гадоў таму (1929) нарадзіўся Апанасевіч Павел Андрэевіч, акадэмік НАН Беларусі, доктар фізіка–матэматычных навук, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, ураджэнец в. Стараселле Докшыцкага раёна.

15 ліпеня – 100 гадоў таму (1914) нарадзіўся Макіёнак Іван Андрэевіч (1914–1944), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Гарадзілавічы Верхнядзвінскага раёна.

15 ліпеня – 75 гадоў таму (1939) нарадзіўся Кірпічэнка Аляксандр Андрэевіч (1939–2007), беларускі вучоны ў галіне псіхіятрыі, доктар медыцынскіх навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, ураджэнец в. Чырына Віцебскага раёна. Працаваў у Віцебскім медыцынскім універсітэце.

16 ліпеня – 65 гадоў таму (1949) нарадзіўся Крыўко Мікалай Нілавіч, беларускі мовазнавец, кандыдат філалагічных навук, ураджэнец в. Манякова Міёрскага раёна.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) ўтвораны Дубровенскі раён.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) ўтвораны Лепельскі раён.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) створана Віцебская акруга. Існавала да 26.07.1930 г.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) створаны Дрысенскі раён. Існаваў да 25.12.1962 г.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) быў створаны Бягомльскі раён. Існаваў да 20.01.1960 г.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) створаны Бешанковіцкі раён.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) быў створаны Валынецкі раён. Існаваў да 09.03.1929 г.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) створаны Гарадоцкі раён.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) ўтвораны Ветрынскі раён. Існаваў з 17.07.1924 г. па 08.07.1931 г. і з 12.02.1935 г. па 20.01.1960 г.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) ўтвораны Віцебскі раён.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) ўтвораны Высачанскі раён у Віцебскай акрузе. Існаваў да 08.07.1931 г.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) створаны Багушэўскі раён. Існаваў з 17.07.1924 г. па 08.07.1931 г. і з 12.02.1935 г. па 20.01.1960 г.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) ўтвораны Дубровенскі раён.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) ўтвораны Дрэтунскі раён у Полацкай акрузе. Існаваў да 03.07.1925 г.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) ўтвораны Езярышчанскі раён у Віцебскай акрузе. Існаваў з 17.07.1924 г. па 26.07.1929 г. і з 18.03.1958 г. па 25.12.1962 г.

2. **Кузняева, С. А.** Касовіч Каятан Андрэевіч / С. А. Кузняева // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / рэдкал.: І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелСЭ імя П. Броўкі, 1986. — Т. 3. — С. 12.

3. **Кузьміч, М. П.** Касовіч Каятан Андрэевіч / М. П. Кузьміч, М. І. Сцепаненка // Імёны, асобы, лёсы : ураджэнцы ў далёкім і блізкім замежжы / М. П. Кузьміч, М. І. Сцепаненка. — Мн. : Літаратура і Мастацтва, 2012. — С. 152—153.

4. **Маслыка, Г.** Касовіч Каятан Андрэевіч / Г. Маслыка // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн імя П. Броўкі, 1997. — Т. 4. — С. 137—138.

5. **Прыгодзіч, М.** Пад псеўданімам «Белоруссъ К. К.» // М. Прыгодзіч // Роднае слова. — 2008. — № 8. — С. 41—43.

6. **Ученые** мужи белорусской земли // Архівы і справаводства = Архивы и делопроизводство. — 2010. — № 1. — С. 156—157.

Цвярской гімназіі, 2-й Маскоўскай гімназіі, Лазараўскім інстытуце ўсходніх моў. Яшчэ калі быў выкладчыкам, пачаў вывучаць і даследаваць яўрэйскую і арабскую мовы, санскрыт. Санскрыт – літаратурна апрацаваная мова арыйскай цывілізацыі ў Індыі, адна з самых старажытных моў свету, якая ўзнікла каля XV стагоддзя да нашай эры. Гэтай мовай ён валодаў так добра, што свабодна чытаў санскрыцкія помнікі «Махабхарата» і «Рамаяна», рабіў пераклады. Пераклаў «Сунд і Упесунд» (1844), «Сказанне пра Дгруву» (1848), «Васантазена» (1849) і інш.

З 1849 г. – член Рускага геаграфічнага таварыства. З 1850 г. – рэдактар навуковых прац Публічнай бібліятэкі г. Пецярбурга. У 1854 г. Каятан Андрэевіч пачаў выданне першага ў Расіі «Санскрыта-рускага слоўніка» (незакончаны). З 1857 г. на грамадскіх пачатках чытаў лекцыі па санскрыцкай мове і літаратуры ў Пецярбургскім універсітэце. Выдаў некалькі эпізодаў з «Махабхарата» з рускай транскрыпцыяй і лацінскім перакладам. Адначасова выкладаў ва ўніверсітэце мову зенд (мова аднаго з іранскіх плямён).

З 1864 г. – выкладчык Харкаўскага ўніверсітэта, прафесар кафедры санскрыцкага мовазнаўства. Каятан Касовіч атрымаў званне ганаровага доктара параўнальнага мовазнаўства. З 1865 г. – прафесар Пецярбургскага ўніверсітэта. Разам з братам І. А. Касовічам выдаў «Грэчаска-рускі слоўнік» (1847). У 1872 г. выдаў збор персідскіх клінападобных надпісаў. У 1854–1875 гг. выйшлі ў яго перакладзе «Яўрэйская граматыка» Гезеніуса і «Яўрэйская хрэстаматыя», якія былі прыняты ў якасці падручнікаў у духоўных семінарыях.

Каятан Андрэевіч Касовіч памёр 26 студзеня 1883 года і быў пахаваны на Смаленскіх праваслаўных могілках у Пецярбурзе.

ЛІТАРАТУРА:

1. **Касовіч** Каятан Андрэевіч // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. — Мн. : БелЭн, 1999. — Т. 8. — С. 150.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) ўтвораны Коханаўскі раён у Аршанскай акрузе. Існаваў з 17.07.1924 г. па 08.07.1931 г. і з 09.09.1946 г. па 17.12.1956 г.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) ўтвораны Копыскі раён у Аршанскай акрузе. Існаваў да 08.07.1931 г.

17 ліпеня – 90 гадоў таму (1924) ўтвораны Ушацкі раён.

17 ліпеня – 55 гадоў таму (1959) нарадзілася Русілка Вольга Іванаўна, беларуская паэтэса, літаратуразнаўца. З 1984 г. працуе ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце імя П. М. Машэрава.

18 ліпеня – 110 гадоў таму (1904) нарадзілася Радзялоўская Алена Паўлаўна (1904–1971), беларуская актрыса. Працавала ў Беларускім тэатры імя Я. Коласа.

18 ліпеня – 105 гадоў таму (1909) нарадзіўся Вішнеўскі Сяргей Антонавіч (1909–1992), беларускі мастак, фатограф, педагог. Працаваў настаўнікам малявання ў Докшыцкай СШ.

18 ліпеня – 80 гадоў таму (1934) нарадзіўся Арлоў Алег Рыгоравіч (1934–1995), беларускі жывапісец, педагог. У 1966–1994 гг. выкладаў у Віцебскім педагагічным інстытуце.

18 ліпеня – 75 гадоў таму (1939) нарадзіўся Шутаў Генадзь Фёдаравіч, беларускі мастак, акварэліст, графік, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі. У 1976–1986 гг. – старшыня Віцебскай абласной арганізацыі Саюза мастакоў Беларусі.

19 ліпеня – 145 гадоў таму (1869) нарадзіўся Вітан-Дубейкаўскі Лявон Іванавіч (сапр. Дубяйкоўскі 1869–1940), беларускі архітэктар, педагог, паэт. Аднаўляў касцёлы ў Оршы, у вёсцы Смаляны на Аршаншчыне, спраектаваў Відзаўскую Успенскую царкву, Дрысвяцкі Петрапаўлаўскі касцёл на Браслаўшчыне.

19 ліпеня – 95 гадоў таму (1919) нарадзіўся Барсукоў Міхаіл Захаравіч (1919–1979), беларускі архітэктар, ураджэнец в. Лучна Полацкага раёна.

19 ліпеня – 95 гадоў таму (1919) нарадзіўся Салянікаў Анатоль Данілавіч (1919–2010), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза, ураджэнец в. Чурылава Аршанскага раёна.

20 ліпеня – 100 гадоў таму (1914) нарадзіўся Багарад Рыгор Абрамавіч (1914–2004), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, поўны кавалер ордэна Славы, ураджэнец г. Віцебска.

